Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Мен. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня—XV
№ 130 (4034)
НЯДЗЕЛЯ, 17 МАЯ
1931 г.
Гэты нумар 5 коп.
Выходзіць
БЕСЬПЕРАРЫЎНА

Тварам да навучальнага году

Пачатак навучальнага году—гэта адзін з важнейшых момантаў ажыцьцяўленьня складаных задач культурнай рэвалюцыі.

Ад таго, наколькі падрыхтавана сустракаецца новы навучальны год у вялікай меры залежыць і якасьць і размах работы па падрыхтоўцы кадраў на працягу цэлага году. Ад гэтага таксама залежыць шырыня работы па ажыцьцяўленьні задач усеагульнага навучаньня. Палітычная важнасьць, вострасьць праблемы кадраў, асабліва ў БССР, відавочна. Ясна таксама і тое, якое вялікае палітычнае значэньне набывае справа ўсеагульнага навучаньня.

Паколькі пасьпяховае вырашэньне гэтых дзьвюх вузлавых задач культурнай рэвалюцыі ў вялікай меры залежыць ад своячасовасьці пачатку навучальнага году, пастолькі падрыхтоўцы да яго (навучальнага году) павінен быць надан характар БАЯВОГА ПАЛІТЫЧНАГА МЕРАПРЫЕМСТВА.

Гэта тым больш неабходна падкрэсьліць, калі мець на ўвазе ВОПЫТ МІНУЛАГА ГОДУ. Апартуністычная сьпячка, бязьдзейнасьць раду ўстаноў, у тым ліку і органаў народнай асьветы, стаўка на самацёк, асабліва ў пытаньнях камплектаваньня—усё гэта знач на ўскладняла справу, стварала лішнія тормазы ў выкананьні паказаных задач.

Бясспрэчна, што такой «работай» пасобныя арганізацыі ліпі ваду на млын клясавага ворага, аб'ектыўна стваралі спрыяючыя ўмовы для яго падрыўной работы, асабліва ў галіне ўсеагульнага навучаньня.

Ліхаманкава супраціўляючыся сацыялістычнаму наступленьню, клясавы вораг паспрабуе выкарыстаць слабыя зьвяньні работы і ў галіне падрыхтоўкі і правядзеньня новага навучальнага 1931-32 году.

Фронт усеагульнага навучаньня, фронт барацьбы за пісьменнасьць, за хутчэйшае і поўнае вырашэньне праблемы кадраў,—ЗЬЯЎЛЯЕЦЦА КЛЯСАВЫМ ФРОНТАМ.

Своячасовая і найлепшая падрыхтоўка да навучальнага году ёсьць адно са зьвеньняў сацыялістычнага наступленьня па ўсім фронце.

Праз своячасовую падрыхтоўку да навучальнага году, як і праз цэлы рад другіх мерапрыемстваў, мы павінны дабіцца, каб пытаньні культурнага будаўніцтва былі поўнасьцю ўзьняты на вышыню рашаючых задач гаспадарчага будаўніцтва.

Да пачатку навучальнага году засталося тры месяцы. Тэрмін кароткі. Работа па падрыхтоўцы зараз павінна быць разгорнута ва ўсю шырыню. Між тым, замест баявой работы ў цэлым радзе арганізацый назіраюцца тэндэнцыі паўтарыць мінулагодняе. Гэта ў першую чаргу трэба сказаць па адрасе БДВ, якое ў мінулым, жадаючы прыкрыць ганебную бязьдзейнасьць «аб'ектыўнымі» прычынамі, выдавала падручнікі і праграмы цэлы год.

ПАЎТАРЭНЬНЯ ТАКОГА «ЭКСПЭРЫМЭНТУ», ЯКІ ПА СУТНАСЬЦІ, МЯЖУЕ СА ШКОДНІЦТВАМ, ДАПУСЬЦІЦЬ НІ Ў ЯКІМ ВЫПАДКУ НЕЛЬГА.

Цэлы рад арганізацый, як Белкаапсаюз, Дзяржплян і інш. да сёнешняга дня нічога не зрабілі. Сярод гэтых арганізацый па пытаньнях навучальнага году панае нейкая міжведамственая бюракратычная чэхарда. Адзін ня даў заявак на адпаведныя рэчы, другі не пакланаціўся зрабіць запрос, а трэці проста ня ведае, што ўстанова павінна рабіць у сувязі з падрыхтоўкай навучальнага году. У выніку гэтага ні НКА, ні Дзяржплян ня ведаюць дакладна колькі і дзе будуецца школ. Да апошняга дня няма канчатковага праекту будаўніцтва вясковых школ. Старыя праекты няпрыгодны, яны не забясьпечваюць правядзеньня політэхнізацыі школы, БЕЛКААПСАЮЗ «забыўся» ўключыць школы ў плян забесьпячэньня газай і іншымі прыладамі. Падручнікі і праграмы і зараз друкуюцца НЕДАПУШЧАЛЬНА НА МАРУДНЫМІ ТЭМПАМІ.

Як гэта ня крыўдна, але і па сёнешні дзень некаторыя арганізацыі працуюць ПА СТАРЫХ ДЗЕДАЎСКІХ ЗВЫЧАЯХ. Бязьдзейнічаюць пакуль «гром не загрыміць».

ГЭТУ ЗВЫЧКУ, ГЭТЫ АПАРТУНІСТЫЧНЫ ДЭВІЗ ТРЭБА РАШУЧА НАЗАЎСЁДЫ АДКІНУЦЬ.

Як органам Нарасьветы, дый самому НКА, так і асабліва гаспадарчым і праф саюзным арганізацыям трэба ЗАРАЗЖА ЗРАБІЦЬ ПАВАРОТ ТВАРАМ ДА НАВУЧАЛЬНАГА ГОДУ.

Ажыцьцяўленьню мерапрыемстваў, якія зьвязаны з правядзеньнем гэтай работы, неабходна надаць БАЯВЫ І САПРАЎДЫ ўдарны характар.

Як навучальныя ўстановы, так і адпаведныя арганізацыі абавязаны ЎЖО ЗАРАЗ клапаціцца наконт асеньняга набору. УЖО ЦЯПЕР пара разгарнуць работу як у галіне растлумачэньня, так і вярбоўкі адпаведнага кантынгенту для камплектаваньня сярэдніх і вышэйшых навучальных устаноў. СТАЎЦЫ НА САМАЦЁК ТРЭБА ВЫНЕСЬЦІ КАНЧАТКОВЫ ПРЫСУД.

Падрыхтоўчая работа да навучальнага году ў ВНУ, і ў прыватнасьці БДУ, і сельска-гаспадарчай акадэміі, павінна прайсьці пад знакам КАНЧАТКОВАЙ ПЕРАБУДОВЫ іх работы. Гэтыя ВНУ навучаньне ў 1931-32 годзе абавязаны пачаць поўнасьцю, перабудаваўшы сваю работу ў адпаведнасьці з пастановай ЦК КП(б)Б.

Важнейшае значэньне ў справе своячасовага пачатку, а таксама якасьці навучаньня адыгрываюць ПРАГРАМЫ.

Складаньне і пераапрацоўку праграм неабходна скончыць як мага хутчэй. Гэта адносіцца ня толькі да школ сацвыху, але і ў вялікай меры да сярэдніх і вышэйшых навучальных устаноў. У прыватнасьці, пара ўнікнуць тэй неразьбярыхі, якая існуе з праграмамі для практыкі. Гэтыя праграмы павінны быць складзены ўжо ДА ПАЧАТКУ навучальнага году.

Пад АСАБЛІВЫ НАГЛЯД трэба ўзяць работу па друкаваньні як праграм, так і падручнікаў. Неабходна ўжыць усе магчымыя меры, каб друкаваньне скончыць ДА ТЭРМІНУ.

У абсягу пытаньняў падрыхтоўкі да навучальнага году балючым месцам і па сёнешні дзень зьяўляецца школьнае будаўніцтва.

З вызначаных у мінулым годзе 446 школ пабудавана толькі 80. Гэта даволі суровы ўрок для таго, каб у гэтым годзе аднесьціся да будаўніцтва з асаблівай сур'ёзнасьцю. Справа ўскладняецца яшчэ і тым, што ў 1931 годзе нам прыдзецца ня толькі пабудаваць 300 новых школ, але і ліквідаваць мінулагодні прарыў.

Школьнае будаўніцтва—гэта разам з тым пытаньне выкананьня праграмы ўсеагульнага навучаньня.

МАБІЛІЗАЦЫЯ РАБОЧАЙ СІЛЫ, ЗАБЕСЬПЯЧЭНЬНЕ БУДАЎНІЧЫМІ МАТАР'ЯЛАМІ, МАБІЛІЗАЦЫЯ ЎНУТРАНЫХ РЭСУРСАЎ—СРОДКАЎ НАСЕЛЬНІЦТВА—ГЭТЫЯ ПЫТАНЬНІ САМІ НАПРАШВАЮЦЦА НА ПАРАДАК ДНЯ.

Партыйныя камітэты, ячэйкі, саветы павінны неадкладна зрабіць усе выплываючыя адсюль вывады. Тое-ж патрэбна сказаць і ў адносінах рамонту.

Для таго, каб своячасова пачаць новы навучальны год, каб унікнуць ускладненьняў, трэба ўжыць усе меры, каб НЕ ДАПУСЬЦІЦЬ АДСЕЎ вучняў са школ, які зараз у пасобных раёнах пачынае прымаць проста ПАГРАЖАЮЧЫЯ разьмеры (30-35 проц.). Неабходна з усёй жорсткасьцю ўдарыць па панікёрскіх настроях, што праяўляюцца ў некаторых мясцох. У гэтых адносінах заслугоўвае ўвагі і рашучага асуджэньня апартуністычная заява Азарыцкага райінспэктара нарасьветы аб тым, што «на зьмяншэньне адсеву надзеі няма».

Там, дзе па-бальшавіцку ўзяліся за зьніжэньне адсеву (Чырвоная Слабада), там дзе зразумелі, што адсеў гэта двухгодніцтва, гэта зрыў праграмы ўсеагульнага навучаньня, там, дзе да канца ўявілі ПАЛІТЫЧНЫ СЭНС гэтай справы,—там захавана адна са спрыяючых умоў для своячасовага пачатку і пасьпяховага правядзеньня новага навучальнага году.

НАВУЧАЛЬНЫ ГОД ПАВІНЕН БЫЦЬ СПАТКАНЫ ВА ЎСЕЎЗБРАЕНЬНІ.

Гэтага мы дабіліся тады, калі ня толькі органы Нарасьветы возьмуцца за справу па-баявому, але і цэлы рад другіх арганізацый, як Белкаапсаюз, Дзяржснаб, Дзяржплян, БДВ перастануць адносіцца да справы навучаньня, як «ня нашай».

На фронт падрыхтоўкі навучальнага году трэба мабілізаваць увагу ўсёй грамадзянасьці, кінуць атрады культармейцаў «лёгкай кавалерыі». Камсамольскія арганізацыі, піянэры на гэтым вучастку работы абавязаны ва ўсю шырыню разгарнуць сваю дзейнасьць.

ПАДРЫХТОЎКА ДА НОВАГА НАВУЧАЛЬНАГА ГОДУ—ГЭТА АДНА З СУКРАЎНЫХ ЧАСТАК БАРАЦЬБЫ ЗА АЖЫЦЬЦЯЎЛЕНЬНЕ задач будаўніцтва нацыянальнай пралетарскай культуры.

Пад такім ўнктам погляду партарганізацыі павінны разглядаць работу адпаведных устаноў у гэтым напрамку.

Пад такім пунктам погляду павінна быць разгорнута самая рашучая барацьба з бязьдзейнасьцю, са стаўкай на самацёк, з апартуністычнай сьпячкай, за ўдарную, сапраўды бальшавіцкую, падрыхтоўку.

25-е мая—апошні тэрмін сяўбы

для паўднёвых раёнаў

Вызначыць штодзённыя заданьні па сяўбе для саўгасаў, калгасаў і МТС

Пастанова Савету Народных Камісараў БССР

СНК БССР адзначае, што веснавая сяўба праводзіцца недапушчальна марудлымі тэмпамі (па 10-V—усяго пасеяна 3,6 проц., а ў раёнах дзейнасьці МТС—2,6 проц), якія не забясьпечваюць выкананьне дырэктыў ЦК КП(б)Б і СНК БССР аб сканчэньні сяўбы ў максімальна кароткі тэрмін.

Асноўнымі прычынамі марудлага ходу сяўбы зьяўляюцца наступныя:

а) частка раённых выканаўчых камітэтаў і гарадзкіх саветаў не паставіла ў цэнтры сваёй работы арганізацыю і правядзеньне веснавой сяўбы, у сувязі з чым дырэктывы ЦК КП(б)Б і СНК БССР аб поўным пераводзе на зьдзельшчыну саўгасаў, МТС і калгасаў ня выкананы;

б) зусім нездавальняюча скарыстоўваецца мэханічная і конская цягавая сіла (замест 21 гадзіны ў суткі трактары працуюць 12-14 гадзін з няпоўнай нагрузкай). Асабліва нездавальняюча працуюць Менская, Касьцюковіцкая, Шклоўская, Дубровенская і Горацкая МТС шына-трактарныя станцыі;

в) рад раённых выканаўчых камітэтаў, раённых калгасаўзаў і саўгастрэстаў ня ўжылі належных захадаў для ўстанаўлечня заданьня саўгасам, МТС і калгасам на кожны дзень і праверкі выкананьня, а таксама не зварочваецца патрэбная ўвага на арганізацыю сяўбы ў адпаасобных гаспадарках;

г) Церахаўскі, Багушэўскі, Ветрынскі, Вульскі, Чэрэйскі, Круглянскі, Вушацкі, Гарадоцкі, Сеньненскі, Быхаўскі, Аршанскі, Расьнянскі, Сіроцінскі і Ляднянскі раённыя выканаўчыя камітэты не забясьпечылі падачы ва ўстаноўлены тэрмін апэрацыйных даных аб ходзе сяўбы.

Адзначаючы павялічэньне тэмпаў прыліву бяднацка-сераднацкіх гаспадарак у калгасы (у апошнюю дэкаду ўвайшло ў калгасы 19 тыс. гаспадарак), СНК лічыць, што гэтыя тэмпы зьяўляецца невыстарчальнымі, асабліва яшчэ адстаюць Гарадоцкі, Бабруйскі, Рэчыцкі, Гомельскі, Парыцкі, Чачэвіцкі, Барысаўскі, Сьмілавіцкі, Сураскі і Чачэрскі раёны, у якіх калектывізавана ад 11,7 проц. да 18 проц.

Выходзячы з гэтага, Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

1) Лічыць асноўнай і важнейшай гаспадарча-палітычнай работай у сучасны момант правядзеньне ў максімальна кароткі тэрмін веснавой сяўбы.

2) Абавязаць раённыя выканаўчыя камітэты, Народны Камісарыят Зямляробства, Белкалгасцэнтр, упаўнаважанага Трактарацэнтру і саўгастрэсты пакінуць апэрацыйнае кіраваньне веснавой сяўбой, зрабіўшы ў рабоце саўгасаў, МТС, калгасаў і аднаасобных гаспадарак рашучы пералом для поўнага выкананьня ў кароткі тэрмін вызначаных плянаў веснавой сяўбы.

3) Мабілізаваць увагу і ўсе сілы раённых арганізацый на сканчэньне ў бліжэйшы час пераводу на зьдзельшчыну ўсіх саўгасаў, МТС, калгасаў. Прапанаваць Белкалгасцэнтру, саўгастрэстам і ўпаўнаважанаму Трактарацэнтру зьвярнуць асаблівую ўвагу на падлік працы ў саўгасах, МТС і калгасах для правільнай аплаты працы ў саўгасах і МТС, і разьмеркаваньне даходаў і ўраджаю ў калгасах па колькасьці і якасьці затрачанай працы.

4) Для паляпшэньня работы МТС і максімальнага скарыстаньня мэханічнай і конскай цягавай сілы, прапанаваць раённым выканаўчым камітэтам прымацаваць да ўсіх МТС адказных работнікаў да канца сяўбы.

5) Прапанаваць раённым выканаўчым камітэтам устанавіць канчатковае заданьне па сяўбе для кожнага сельскага савету, саўгасу, МТС і калгасу з тым, каб у паўднёвай частцы БССР сяўба ў асноўным была скончана 25 мая, а ў іншых раёнах не пазьней 5 чэрвеня, максімальна ўзмацніўшы праверку і забясьпечыўшы лепшы падлік ходу сяўбы і своячасовую інфармацыю НКЗямляробства пяцідзённкамі па ўстаноўленай форме.

6. Прапанаваць Белкаапсаюзу, гарадзкім саветам і раённым выканаўчым камітэтам забясьпечыць лепшае правядзеньне сяўбы ў прыгарадных гаспадарках, асабліва зьвярнуўшы ўвагу на пасадку гароднины ў максімальна кароткі тэрмін.

7. Прапанаваць раённым выканаўчым камітэтам і калгасаўзам зьвярнуць максімальную ўвагу на замацаваньне існуючых калгасаў і асабліва новаарганізаваных, а таксама ўзмацніць работу па ўцягненьні бяднацка-сераднацкіх гаспадарак у калгасы.

8. Даручыць НКЗямляробства, упаўнаважанаму Трактарацэнтру, саўгастрэстам і раённым выканаўчым камітэтам, побач з правядзеньнем веснавой сяўбы, узмацніць падрыхтоўку да ўборачнай і асеньняй пасеўнай кампаніі.

9. Прапанаваць цэнтральным і раённым газэтам шырока разгарнуць папулярызацыю мерапрыемстваў па падрыхтоўцы да ўборачнай і асеньняй пасеўнай кампаніі і стварэньня кармовай базы, асабліва зьвярнуўшы ўвагу на ўборку тэхнічных культур (ільну, канапель, бульбы, гароднины і інш.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. ГАЛАДЗЕД.
Кіраўнік Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнага Савету БССР С. КАНДЫБОВІЧ.
16 мая 1931 г. г. Менск.

Папяровая і кардонная прамысловасьць БССР выканала пяцігодку за два з паловай гады

Беларускім групавым кіраўніцтвам Саюзпаперы ў складзе трох папяровых фабрык: „Спартак", „Чырвоная зорка" і „Прафінтэрн" і трох кардонных фабрык: імя Сталіна, імя Вароўскага і імя Леніна выканана пяцігодка за два з паловай гады.

За час з 1 красавіка 1930 г. па 1 красавіка 1931 г. выпуск прадукцыі ў цэннасным азначэньні перавышае вызначаны на апошні год пяцігодкі выпуск прадукцыі на 37,6 проц. У натуры ёсьць перавыкананьне:

Па паперы—на 62,9 проц., па кардоне і драўлянай масе—на 51,4 проц.

Пяцігодка выканана таксама кожным з гэтых прадпрыемстваў у паасобку.

Посьпехі дасягнуты дзякуючы гэраічным намаганьням рабочых папяровай прамысловасьці і ўкараненьню сярод іх сацыялістычных мэтадаў працы.

Кіраўнік БГК „Саюзпаперы" Аўг.
Старшыня ЦП саюзу Розман.

ПАДБРОДЗКАЯ ПРАВАКАЦЫЯ--

падрыхтоўка да крывавай „пацыфікацыі" Зах. Беларусі

Агнём і мячом фашызм прабуе стрымаць узрастаючыя сілы рэвалюцыі

Да рабочых, калгасьнікаў і працоўных Савецкай Беларусі

Новая правакацыя падрыхтоўваецца ў патайных габінэтах польскай ахранкі. У сувязі з кінутымі на Падбродзкую станцыю (у Віленскім ваяводзтве— Зах. Беларусі) дзьвюма гранатамі, фашысцкі друк, па ўказцы польскай контр-разьведкі, патрабуе крыві новых тысяч рабочых і сялян Заходняй Беларусі, шыбеніц для камуністаў і рабочых, новых масавых расстрэлаў і катаваньняў працоўных.

Таварышы! Белапольскія каты жаюць намер правесьці ўціхаміраньне Заходняй Беларусі, па прыкладзе нядаўняга крывавага ўціхаміраньня Заходняй Украіны.

Хістаецца глеба пад нагамі фашысцкай, белапанскай акупацыі. У Заходняй Беларусі яшчэ больш, чым ва ўсёй Польшчы, польскі фашызм сядзіць на распаленых вуглях. Першамайскія выступленьні рабочых і сялян Польшчы навочна паказалі магутны рост баявой волі мільёнаў рабочых і сялян, іх рашучую гатоўнасьць пад сьцягамі камуністычнай партыі Польшчы і Заходняй Беларусі выступіць у канчатковую рашучую бойку за ўладу, за зьвяржэньне фашысцкай дыктатуры, за сваё сацыяльнае і нацыянальнае вызваленьне.

Новай страшэннай правакацыяй у Падбродзьдзі, новым разгулам тэрору, шыбеніцамі і расстрэламі польскі фашызм адказвае на набліжэньне рэвалюцыі ў Польшчы.

Рабочыя заводаў і фабрык і вы, таварышы калгасьнікі, ці зможаце вы спакойна, роўнадушна назіраць падрыхтоўку новай правакацыі, на патокі крыві вашых братоў у Заходняй Беларусі, на пажары вёсак працоўных сялян?

—Не! Справа рабочых Польшчы, Заходняй Беларусі і Зах. Украіны—наша кроўная, родная справа.

Ударнікі варштатаў і палёў, не забывайце таксама аб тым, што трупамі нашых братоў па крыві і клясе польскія капіталісты і памешчыкі хочуць пралажыць дарогу для драпежніцкага нападу на нас, на ўдарную брыгаду сусьветнай рэвалюцыі, на краіну Саветаў.

МЫ, РАБОЧЫЯ ЧЫГУНА-ЛІЦЕЙНАГА ЗАВОДУ ІМЯ СТАЛІНА, абураныя новай нячуванай правакацыяй польскага імпэрыялізму ў адносінах да рэвалюцыйнага лягеру Заходняй Беларусі, заклікаем вас узьняць свой магутны, пралетарскі, ударніцкі голас пратэсту супроць крывавай «пацыфікацыйнай» кампаніі ў Заходняй Беларусі і Заходняй Украіне, супроць разгулу белага тэрору, супроць новых правакацый польскіх фашыстаў.

Мы абяцаем і заклікаем вас павялічыць рады ўдарнікаў, яшчэ больш намагчы нашы сілы ў барацьбе за выкананьне і перавыкананьне плянаў трэцяга рашаючага году пяцігодкі, за ўзмацненьне дапамогі нявольнікам капіталу, за ўзмацненьне падрыхтоўкі да абароны савецкай краіны ад нападу, які падрыхтоўваецца імпэрыялістамі.

У адказ на падбродзкую правакацыю—няхай яшчэ вышэй узьнімаецца сьцяг рабочых і калгасьніцкіх спраў на франтох наступленьня сацыялізму, няхай мацней загучыць голас пралетарскага пратэсту.

АГУЛЬНЫ СХОД РАБОЧЫХ ЧЫГУНА-ЛІЦЕЙНАГА ЗАВОДУ ІМЯ СТАЛІНА.

гор. Бабруйск

Украінскія папы ў Польшчы — актыўныя дапаможнікі фашызму ў падрыхтоўцы інтэрвэнцыі.

Супроць тэрору, супроць фашысцкіх правакацый

Польскі імпэрыялізм на ўсіх парах рыхтуецца да ваенных авантур

Сустаўной часткай гэтай ліхаманкавай падрыхтоўкі зьяўляецца крывавы тэрор фашызму супроць нацыянальна - вызваленчага руху на ЗБ і ЗУ. Карныя экспэдыцыі на Заходняй Украіне ўвайшлі ў арсенал нацыянальнай палітыкі польскіх акупантаў, як адна з самых ганаровых зброй гэтай палітыкі.

Фашызм імкнецца задушыць рух мас. Фашызм арганізуе рэанэтайныя правакацыі. Фашызм ідзе на самыя агідныя, самыя морсткія і ўтончаныя мэтады тэрору, каб разграміць нарастаючыя сілы рэвалюцыі.

Зараз на ЗБ — фашысцкая прэса вядзе шалёную правакатарскую кампанію з поваду падзей у Падбродзьдзі. Правакацыям фашызму няма межаў. Акупанты кідаюць правакацыйныя бомбы ў Падбродзьдзе, гаворачы, што гэта работа КПЗБ. Яны павялі новае шалёнае цкаваньне ўсяго нацыянальна-вызваленчага руху і правадыра мас — кампартыі.

Гэта чарговая правакацыя знаходзіцца ў сувязі з усёй палітыкай польскага фашызму. У сувязі з падрыхтоўкай да вайны, у адказ на ўзрастаючую хвалю масавых рэвалюцыйных выступленьняў, у адказ на барацьбу працоўных ЗБ — польскія фашысты арганізуюць правакацыі, каб імі прыкрыць НОВАЕ крывапусканьне, НОВЫЯ карныя экспэдыцыі на ЗБ, НОВУЮ «пацыфікацыю».

Так, і толькі так можна расцэньваць характар, мэту і сэнс тэй правакацыйнай кампаніі, якую вядуць польскія фашысты, пры поўным падтрыманьні сацыял-фашыстаў і нацыянал-фашыстаў і побач з якой ідуць новыя арышты, зьбіваньні, катаваньні, новыя Луцкі і Ліды.

Але фашыстам ня ўдасца гэта правакацыя. У адказ на карныя экспэдыцыі працоўныя ЗБ — разам з працоўнымі ўсёй Польшчы і Заходняй Украіны — яшчэ шырай разгорнуць фронт контрэкспэдыцыйных і наступальных баёў, яшчэ больш арганізавана згуртуюцца пад баявым кіраўніцтвам кампартыі, яшчэ больш магутным масавым адпорам ударацьпо крывавых плянах і замыслах фашыстаў.

Магутнымі дэманстрацыямі, палітычнымі забастоўкамі, мітынгамі, арганізаванай дружнай самаабароны, узмацненьнем барацьбы супроць ваенных ... ковага цяжару, супроць ваенных ... рыхтовак і нацыянальнага прыгнечаньня адказваюць і будуць адказваць працоўныя ЗБ на тэрор ... правакацыі фашыстаў.

А працоўныя Беларускай ССР выказваюць свой гнеўны пратэст супроць новых правакацый разьюшаных фашыстоўшчыны.

Рабочыя Бабруйскага чыгуна - лі цейнага заводу імя тав. Сталіна першыя адгукнуліся на новую, падбродзкую правакацыю. Яны выказалі свой гнеўны пралетарскі пратэст і канкрэтнымі справамі на фронце сацыялістычнага будаўніцтва, у справе дапамогі змагаром за рэвалюцыю і ў галіне ўзмацненьня абароназдольнасьці нашай краіны адказваюць на справу Падбродзьдзя. Іх закліку пасьледуюць усе рабочыя, калгасьнікі і працоўныя Савецкай Беларусі.

Супроць арганізацыі карных экспэдыцый на Заходняй Беларусі!

Супроць правакацый і тэрору!

Катаржныя прысуды за выступленьне супроць прымусовай працы

ВІЛЬНЯ, 16. Сыстэма прымусовай працы (шарваркі), якой у шырокіх разьмерах карыстаецца фашысцкая ўлада пры пабудове мастоў, дарог і стратэгічных чыгуначных ліній, выклікае сярод сялянства вялікае абурэньне. Сяляне часта адмаўляюцца выконваць гэту паншчыну, якая, у дадатак, накіравана на падрыхтоўку інтэрвэнцыі супроць СССР.

Нядаўна ў Баранавіцкім павеце пля вёсак ЛЯСЕВІЧЫ І ЗАКУНАВІЧЫ, Стаповіцкай гміны, фашысцкая ўлада пачала пабудову моста. Мост патрэбен быў для ваенных мэт, бо мясцовасьць гэта вельмі балоцістая, непраходная для артылерыі і г. д.

Паліцэйшчына ў прымусовым парадку ганяла сялян на работу, прычым усіх тых, хто адмаўляўся, — нерэдкі арыштамі і вялікімі штрафамі. Абурэньне сялян павялічвалася з кожным днём. Урэшце сялянства цэлай вёскай кінулася да насканчанага маста і ПАЧАЛО ЯГО РАЗБУРАЦЬ. Прыбыўшы значны атрад паліцэйскіх атакаваў сялян. Распачаўся зацяты бой. Сяляне, узброеныя віламі і косамі, акружылі і разброілі паліцэйскіх, якія потым былі адведзены ў вёску і пад ахоўай батраноў зачынены ў хлеў.

Праз некаторы час староства, якое даведалася аб выступленьні сялянства, выслала вялікі паліцэйскі атрад пад кіраўніцтвам афіцэра, які пачаў бязьлітасную расправу. Былі праведзены шматлікія арышты.

12 мая Баранавіцкі акруговы суд разглядаў справу арыштаваных сялян. На падставе заступных сьведак — шпікаў і паліцэйскіх — фашысцкі суд пасьля кадоўгай «нарады» прыгаварыў адных на 3 ГАДЫ, а рашту 12 СЯЛЯН ПА 2 ГАДЫ КАТАРГІ КОЖНАГА.

Бурная дэманстрацыя ў часе пахаваньня ахвяры фашысцкага тэрору

ВІЛЬНЯ, 12. Загінуў палітзьняволены Піроцкі, якога з правінцыяльнай турмы перавозілі ў турму ў Вільні. Каб унікнуць рабочых дэманстрацый, пахаваньне адбывалася ноччу. Жалобная працэсія суправаджалася вялікім атрадам паліцыі. Ня гледзячы на ўсе гэтыя перасьцярогі, віленскія рабочыя арганізавалі ў часе пахаваньня дэманстрацыю, прыбыўшы на могілкі вялікай масай. Пры магіле Піроцкага пакінута паліцэйская варта. Увечары 11 мая адбылася дэманстрацыя ў цэнтры гораду на Нямецкай вуліцы. Уначы-ж паліцыя знайшла вывескі шанымі на провадзе трамваю транспаранты з антыдзяржаўнымі пэзунгамі.

МАСАВЫЯ АРЫШТЫ РАБОЧАЙ МОЛАДЗІ Ў ЛОДЗІ

ВАРШАВА, 13. Польскае тэлеграфнае агенцтва паведамляе, што 10 мая ўвечары палітычная паліцыя арыштавала ў песе ў вакопіцах Лодзі 60 УДЗЕЛЬНІКАЎ МІТЫНГУ.

ПРЫМУСОВАЯ ПРАЦА ДЛЯ БЕСПРАЦОЎНЫХ

ВАРШАВА, 9. Орган лодзінскіх фабрыкантаў-пісудчыкаў «Праўда» ў радзе артыкулаў выступае з катэгарычным заклікам увесьці ў Польшчы сыстэму прымусовай працы для беспрацоўных і адмяніць сацстрах і ўсялякія дапамогі па беспрацоўі. Газэта піша: «Становішча рабочай клясы нясумнена будзе вельмі цяжкім на працягу доўгага часу і мы ўсёроўна ня можам разьлічваць на захову сьмітатый рабочай клясы да ўладу. Нават пры наяўнасьці сацстраху 300-тысячная армія беспрацоўных, сканцэнтраваная ў некалькіх буйных цэнтрах, усёроўна зьяўляецца небясьпекай для грамадзкага парадку. Выходзячы з гэтых меркаваньняў, газэта патрабуе адмены такіх «палятыўных мерапрыемстваў», як сацстрах, больнічныя касы, нармаваны рабочы дзень і т. д.». (ТАСС).

ЛЕКАУТ 7.000 РАБОЧЫХ У БЕМСКУ

ВАРШАВА, 14. Як паведамляе сацыял-фашысцкі «Роботнік», барацьба рабочых у тэкстыльнай акрузе Бельск-Бяла з наступленьнем капіталістаў надзвычай завастраецца. Капіталісты пастанавілі правесьці 30 ПРОЦ. ЗЬНІЖЭНЬНЕ ЗАРПЛАТЫ і значнае пагаршэньне ўмоў працы. Рабочыя рашуча адмовіліся прыняць новыя ўмовы працы і абвясьцілі агульную забастоўку, у якой прынялі ўдзел 19 ФАБРЫК.

Капіталісты, каб зламаць салідарны фронт рабочых, абвясьцілі пёкаут, звальняючы звыш 7.000 РАБОЧЫХ.

Вугальныя магнаты выкідваюць тысячы рабочых

ВАРШАВА, 14. Тэмп паглыбленьня эканамічнага крызісу ў Польшчы бязупынна ўзмацняецца. Асабліва ярка гэта назіраецца ў Верхняй Сілезіі.

Вугальныя магнаты, князь Доннэрсмарк і граф Шаўготш, праводзяць на сваіх капальнях значныя скарачэньні рабочых. Так, у капальні «Готгард», «Літандра» і «Павел» выкідваюць на вуліцу звыш 550 рабочых.

Дырэкцыя капальні «Елена» звальняе 520 рабочых.

Фашысцкая ўлада дала капіталістам дазвол на звальненьне ў капальнях «Гільдэбранд», «Ашэнборн» і «Гэшэ» 510 рабочых.

Праводзячы жорсткую капіталістычную рацыяналізацыю, уласьнікі цынкавай гуты «Гогэнлоэ» выкідваюць на брук усіх рабочых, якія маюць 50 год жыцьця. Такім чынам, будзе пазбаўлена ўсякіх сродкаў існаваньня звыш 400 рабочых.

Значныя скарачэньні рабочых адбываюцца і ў Лодзінскай тэкстыльнай прамысловасьці. Прамысловыя прадпрыемствы Грохмана звольнілі 610 рабочых. Як паведамляе орган эндэкаў, «Газэта Варшавска», такія-ж самыя скарачэньні будуць праводзіць усе іншыя тэкстыльныя прадпрыемствы.

Зьлёт генштабу ў Румыніі

РАСПРАЦОЎКА ПЛЯНУ НАПАДУ НА СССР

ВЕНА, 14. Як паведамляюць з Бухарэсту, на ваенных урачыстасьцях, якія адбыліся 10 мая з поваду стагодзьдзя румынскай армії, прысутнічалі ў якасьці «дэлегатаў» прадстаўнікі ўсіх генштабаў Малой Антанты і Польшчы. З Чэхаславакіі, апрача начальніка генштаба Сіровы, прысутнічалі таксама нач. нач. генштаба француз Абоа, начальнік разьведкі пры генштабе генэрал Хапупа і начальнік апэрацыйнай часткі палкоўнік Сяргей. З Югаславіі прысутнічалі, акрамя нач. генштаба — Міпавановіча, яго намесьнік генэрал Косіва, начальнік аддзелу разьведкі, — генэрал Міхайлаў і начальнік апэрацыйнай часьці генэрал Жыўковіч. Сьвяткаваньне фактычна было скарыстана для правядзеньня нарады генштабаў гэтых краін. (ТАСС).

Націск францускага імпэрыялізму на Аўстрыю

ВЕНА, 15. У венскіх дыпляматычных колах цыркулюць чуткі, што замежная банкаўская група, у якую ўваходзяць парыскі і лёнданскі банкірскія дамы Ротшыльда, Шнэйдэр-Крэзо, Уніён Эндустрыэль, Банк дэ-Пары і Банк дэ-Пэйі Ва, прапанавала аўстрыйскаму ўраду гарантаваць доўгатэрміновую пазыку на суму 150 млн. шылінгаў, якая будзе разьмешчана пры дапамозе рэпарацыйнага банку пры ўмове, калі Аўстрыя адмовіцца ад мытнага саюзу з Нямеччынай.

Шалёная падрыхтоўка Румыніі да новай вайны

ВЕНА, 13. Паводле паведамлёньня з Бухарэсту ваенны міністар ураду Іорга — генэрал Стэфанэску апублікаваў праграму ўдасканаленьня румынскіх узбраеньняў, будаўніцтва новых крэпасьцяй і разьвіцьця ваеннай прамысловасьці. У праграме прадугледжваецца таксама стварэньне «тэхнічнага генэральнага штабу» для армії ў складзе ваенных спэцыялістаў і прадстаўнікоў прамысловасьці. Прадбачыцца вялізацыя ўсяго дзяржапарату.

РЭВАЛЮЦЫЙНЫ РУХ У ГІШПАНІІ РАЗРАСТАЕЦЦА

РАБОЧЫЯ БЯРУЦЦА ЗА ЗБРОЮ

Масавы разгром манастыроў; папы масамі ўцякаюць ва Францыю

Масавы рух супроць рэлігійнай атруты

ЛЁНДАН, 14. Згодна паведамленьня з Гішпаніі, антыклерыкальны рух ахапіў усю краіну.

Асабліва бурны характар мае рух у паўднёвых раёнах. У результаце сутычак паміж беспрацоўнымі і грамадзянскай гвардыяй (жандармерыяй) у Кардове і іншых гарадох, ва ўсёй правінцыі Андалузіі ўведзена ваеннае становішча. У час сутычкі ў Кардове 5 беспрацоўных забіта, 25 паранена. Для Андалузіі характэрна тая абстаноўка, што дэманстранты ўсімі спосабамі дабіваюцца захвату, а на многіх гарадох і захватвалі склады зброі. Сустрэны хваляваньні і напады на каталікія манастыры мелі месца ў Хэрэсе, Сэвільлі, Сан-Лукары і Карыляне. У Алжэсірасе ноччу адбыліся хваляваньні. На мінаносцы «Лаурыя», які стаяў на якары на рацэ Гвадыяна, выбухнуў бунт. Большасьць экіпажу арыштавана і кінута ў турмы.

Папы і контр-рэвалюцыянэры ўцякаюць ва Францыю

ПАРЫЖ, 13. Згодна паведамленьня агенцтва Гавас, праз Ірун (пагранічная станцыя на поўначы Гішпаніі) перайшло граніцу шмат папоў з розных гарадоў Гішпаніі.

Кардынал - прымат (кіраўнік гішпанскай царквы) перайшоў францускую мяжу. У Саламанцы і Сарагосе духавенства скрываецца ў прыватных дамох.

У гарадох паўднёвых правінцый Гішпаніі — Альмерыі, Мурсіі, Малаге Кадыксе, а таксама ў Сэвільлі папы духавенства скрываюцца ў прыватных дамох, з намерам уцякаць з Гішпаніі.

Масы паляць

Змагацца за аўладаньне тэхнікай ГАСПАДАРЧАГА РАЗРАХУНКУ

Хромавы цэх „Бальшавіка“ на аснове гаспадарчага разрахунку ліквідаваў прарыў

На „Чырвоным мэталісьце“ ва ўнутрызаводзкіх дагаворах легалізавана скарачэньне прамфінпляну

Не дапускаць скажэньняў гаспадарчага разрахунку, на-ходу выправіць памылкі

КАНТРОЛЬ РУБЛЁМ УКАРАНІЦЬ ВА ЎСЕ ПОРЫ НАРОДНАЙ ГАСПАДАРКІ!

Гаспадарчы разрахунак на паперы

Пачынаньне брыгад не знаходзіць падтрыманьня

«ЧЫРВОНЫ МЭТАЛІСТ» (Віцебск). Згодна загаду дырэкцыі, павінен быў быць поўнасьцю пераведзен на гаспадарчы разрахунак з 1 сакавіка. Адпак, у сапраўднасьці большая частка рабочых і цэхавай адміністрацыі нават ня былі азнаёмлены з гэтым. Таму ня будзе дзіўным, што ўвесь «перавод» вылыўся толькі ў тым, што загадчык пісэрнага цэху тав. Горскі адмовіўся перакінуць у іншыя цэхі лішак рабочай сілы. Ніякай работы на ажыцьцяўленьні загаду аб пераходзе цэхаў на гаспадарчы разрахунак фактычна ня было праведзена на працягу цэлых двух месяцаў — да 1 мая.

Якое-ж становішча на сёньняшні дзень?

Па словах заводакіраўніцтва на гаспадарчы разрахунак пераведзена ўжо з семі асноўных цэхаў 5: пісэрны, плужны, аборачна-сьлясарны, такарны і рамонтны. Так, лічыцца на паперы, але сапраўднае становішча рэчаў зусім іншае. Вось некалькі прыкладаў.

Заводакіраўніцтва заключыла з цэхавай адміністрацыяй дагаворы, ня выходзячы з пічбаў, прадугледжаных прамфінпляном, а з фактычнага штодзеннага выпуску прадукцыі, які значна меншы прынятых заданьняў. Такім чынам, над шыльдай гаспадарчага разрахунку мы маем ЛЕГАЛІЗАЦЫЮ СКАРАЧЭНЬНЯ ПЛЯНАЎ.

Заключаны дагаворы паміж цэхамі, але і яны не стымулююць павышэньня прадукцыйнасьці працы, поўнай мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў, эканоміі расходу сырцу. Няма ніякага ўліку выдачы в цэху ў цэх поўфабрыкатаў. Ёсьць шмат выпадкаў, калі рабочыя плужнога цэху бяруць з загатоўчага цэху поўфабрыкаты незалежна ад норм расходу. Так, замест жалеза 12×45, прынаначанага для плугоў, выдаткоўваюць 12×50; замест 30-міліметровых балтоў выдаткоўваюцца 40-міліметровыя, ня гледячы на наяўнасьць першых.

Улік выдаткаваньня нафты на адзінку вырабу зусім адсутнічае. Кантрольны сабекошт паасобных поўфабрыкатаў не ўстаноўлен.

Цэхі ўлічваюць па пяцідзесяцах толькі колькасны выраб прадукцыі, па якасных-жа показальніках вынікаў няма ніяк за першы квартал. Сапраўдны разрахункаў паміж цэхамі засталася тэй-жа самай, як і раней.

Надзвычай паказальна, што пункт дагавору рамонтнага цэху, які патрабаваў адачы рамонту і заказаў на новыя дэталі, на 3 дні раней пачатку рамонту, сустраў супраціўленьне з боку іншых цэхаў. Тут выразна праявілася нежаданьне адмовіцца ад ранейшай бясплянавай работы, нежаданьне загадзя пакладаніцца аб рамонце і патрэбных штампах дэталяй.

Гаспадарчы разрахунак яшчэ зусім не ўкараніўся ў работу брыгад. Ініцыятыва брыгады фармаўшчыкоў пісэрнага цэху ня была падтрымана, а загадчык плянавага аддзелу тав. Лазоўскі проста адказаў: «З таго, што брыгада пераключыцца на гаспадарчы разрахунак, ніякай карысьці ня будзе, і наогул гэта ня справа плянавага аддзелу» (?).

У цэхах слаба адчуваецца адзінаначальне, адказнасьць за работу з боку загадчыкаў цэхаў.

Загадчык плужнога цэху тав. Швыпла, замест таго, каб у сувязі з адсутнасьцю работы зволіць у чарговы водпуск 9 чалавек, кось ужо на працяку некалькіх дзён выплачвае ім 5-6-гадзінны прастой толькі таму, што ў водпуск трэба адпускаць ня больш 80 проц. рабочых. У гэтым-жа цэху амаль штодзенна атрымліваюць за прастой чорнарабочыя ў той час, калі іх можна было скарыстаць на сартаваньні адыходаў і браку.

Загадчык такарнага цэху т. Шчэмелеў, ня гледячы на ўказаньне кантрольнага аддзелу аб няправільнай праточцы валаў для жмыха-дробілак, ня прыняў ніякіх мер, у выніку чаго 21 вал быў забракован.

Нельга не адзначыць, што завод не атрымаў ніякай дапамогі ў галіне пераходу на гаспадарчы разрахунак з боку Белмэтапляб'яднаньня, якое абмежавалася толькі запросам — ці пераведзены цэхі на гаспадарчы разрахунак.

Гаспадарчы разрахунак на «Чырвоным мэталісьце» праведзен фармальна. Вакол гэтага пытаньня не сканцэнтравана ўвага ўсяго заводзкага калектыву. Пераход ня даў гаспадарчага эфэкту, ня ўзьняў адказнасьці за выкананьне вытворчых заданьняў. Заводзкае кіраўніцтва, у выніку бюракратычнага падыходу, ня здолела зрабіць гаспадарчы разрахунак сапраўдным зброяй барацьбы з бесгаспадарчасьцю, з безадказнасьцю. У гэтым напрамку неабходна зараз-жа дабіцца карэннага пералому, неадкладна ўзяцца на-сапраўднаму за аўладаньне тэхнікай гаспадарчага разрахунку.

Брыгада «Зьвязды»:

А. ЗАРУБЕЖНЫ, Я. ЧЫРВОНЫ.

У Віцебску дагаворная ня скончана

Матар'яльная адказнасьць—аснова дагавораў

Цэлы рад прадпрыемстваў і ўстаноў Віцебску да гэтага часу яшчэ не наклалі свае дагаворы у Дзяржбанк і тым самым пазбавілі сябе атрыманьня крэдытаў.

Да гэтых прадпрыемстваў і ўстаноў трэба аднесьці Будкантору, Сампрамсклад, Белмяса, бісфабрыку, цагельні Будаб'яднаньня № 2 і 5, вапнавы завод, фабрыку імя Вароўскага, гуту «Ноўка» Саюзскур, беларускую і заходня-дзьвінскую сплаўныя канторы.

Віцебскім аддзяленьнем Дзяржбанку ўсім выпэйпералічаным прадпрыемствам закрыт крэдыт.

Несваячасовае заключэньне дагавораў дрэнна адбіваецца на ходзе работы фабрык і заводаў. Напрыклад, фабрыка «Сьцяг індустрыялізацыі» аформіла свае дагаворы толькі 11-га мая і з гэтай прычыны ня мела магчымасьці своячасова выкупіць дасланы ёй Саюзшэрсьцю сырэц на 190 тыс. руб. Цяпер фабрыка прымушана плаціць наўстойку за несваячасовы выкуп сырцу.

У большасьці заключаных дагавораў адсутнічаюць пункты, якія-б паказвалі тэрмін на забесьпячэньні і эбыце, формы разьбіву паміж прадпрыемствамі і адказнасьць за наўстойку.

Акупярная фабрыка заключыла дагавор з Мэдсанабтрэстам на забесьпячэньні яго прадукцыяй на працягу 8-мі месяцаў на 3.180 тыс. руб., але не паказала, якая колькасьць прадукцыі будзе адгружацца Мэдсанабтрэсту штомесячна і таму Дзяржбанк ня мае магчымасьці кожны месяц крэдытаваць акупярную фабрыку. Наогул трэба адзначыць, што кіраўніцтва акупярнай фабрыкі займаецца «очковтирательством». Гэта відаць з таго, што згодна заключаных дагавораў акупярная фабрыка павінна забесьпечыць за працягу 8-мі месяцаў Мэдсанабтрэст і трэст тэхнікі бясьпечнасьці прадукцыяй на 5.180 тыс. руб. у той час, калі прамфінплян за гэтыя 5 месяцаў прадугледжвае выпуск прадукцыі ўсяго на 4.700 тысяч рублёў. Зусім ясна, што гэты «нумар» быў зроблен для таго, каб штучна павялічыць ліміты. У дагаворы, заключаным паміж акупярнай фабрыкай і камтрэстам па забесьпячэньні фабрыкі электраэнэргіяй, не паказана, якім чынам фабрыка будзе разлічвацца з камтрэстам.

У дагаворы, заключаным паміж заводам «Чырвоны мэталіст» і інвалідным камбінатам забесьпячэньні заводу спецвопраткай на 10.000 руб., няма пункту, які-б гарантаваў своячасовасьць дастаўкі спецвопраткі. Згодна заключанага дагавору паміж заводам «Чырвоны мэталіст» і лесазводам па забесьпячэньні апалам ня ўстулен пункт аб адказнасьці за наўстойку.

Фабрыка «Сьцяг індустрыялізацыі» заключыла дагавор з ф-кай «Прафінтэрн» на дастаўку апошняй поўфабрыкатаў, але ў дагаворы не паказана колькасьць поўфабрыкатаў, якая будзе высылацца штомесячна. У выніку банк ня ведае, я кое сумы выходзіць пры крэдытаваньні.

Белказпэсаюз, калі заключаў дагавор з віцебскім ЦРК і ЗРК розных прадпрыемстваў па забесьпячэньні апошніх прадукцыяй і прамтаварамі, не ўказаў, ад якіх арганізацый яны павінны атрымліваць вызначаныя прадукты і прамтовары. Таксама ў дагаворы адсутнічаюць пункты, якія-б гарантавалі своячасовасьць дастаўкі і адказнасьць за наўстойку. Якім мэтадам будзе рабіцца разлічэньне—таксама не паказана.

Белмэтапляб'яднаньне пры вызначэньні сваім прадпрыемствам ліміту на сумы ў дарозе ня прымала пад увагу іх патрэбнасьць. Так, акупярнай фабрыцы вызначан ліміт сумы ў дарозе 116.000 руб. у той час, калі фабрыка ўжо ў першую дэкаду адгрузіла рознай прадукцыі на 166 тыс. руб. Зараз фабрыка ня можа выкупіць ад Белдзяржснабу сырэц на 12.000 руб. Трэба падкрэсьліць, што гэты сырэц вельмі патрэбен фабрыцы, бо без яго нельга скончыць шмат загатоўленых поўфабрыкатаў і навыкуп сырцу ставіць пад пагрозу далейшую работу фабрыкі.

Па многіх фабрыках і заводах дагаворная кампанія праводзілася габінэтна. Так, на гарбарні, «Чырвоным мэталісьце», фабрыцы гнутай мэблі і алеўні рабочыя ў правядзеньне гэтай кампаніі ня былі ўцягнуты, а на фанэрным заводзе гэтым пытаньнем амаль зусім не займаліся.

Усе вышэйпаданыя факты гавораць за тое, што вялікая колькасьць віцебскіх прадпрыемстваў пры правядзеньні дагаворнай кампаніі не аддавала ўвагі якасьці дагавораў, а выходзіла з таго, каб «толькі правесьці», а цэлы рад прадпрыемстваў яшчэ і да гэтага часу ў гэтым напрамку нічога не зрабілі. Такое становішча вымагае хуткага ўмяшаньня РСІ.

БРЫГАДА «ЗЬВЯЗДЫ»: ЗАРУБЕЖНЫ, ЛЕВІН.

Дабіліся перамогі

ДРУГІ ХРОМАВЫ ЦЭХ ГАРБАРНІ «БАЛЬШАВІК» ганебна адставаў. Прарыў усё павялічваўся. У студзені ён складаў 6 проц., потым вырас да 12. Прагулы ў сакавіку складалі 0,11 проц., у красавіку — 0,13 проц.

Заводзкі «трыкутнік» пачаў шукаць мэтадаў, якія-б дапамаглі ліквідаваць прарывы.

У цэху быў хаос. Загадчык цэху т. Кпюм быў добрым спэцыялістам, але ня ўмеў кіраваць, ня ўмеў правільна расставіць рабочую сілу. Грамадзкія арганізацыі сплі. Сацспаборніцтва і ўдарніцтва было на паперы. Ударныя брыгады разваліліся з-за адсутнасьці кіраўніцтва.

Старыя рабочыя больш цярпець гэтага не маглі. Яны патрабавалі кіраўніцтва. Яны патрабавалі зьмены загадчыка цэху і высунулі кандыдатуру старога рабочага ШЫМЧАКА, які быў вылучан на работу ў прыёмную ЦВК СССР.

Тав. Шымчака ўдалося вярнуць з Масквы на завод. Ён прыняў другі хромавы цэх якраз у той час калі цэхі пераходзілі на гаспадарчы разрахунак. Тав. Шымчак стаў «дырэктарам» цэху. Заводакіраўніцтвам быў заключан дагавор які абавязваў абодвы бакі больш клапаціцца аб бесьперабойнай рабоце цэху.

Дагавор абмяркавалі рабочыя У цэху сур'ёзна ўзяліся за работу. Зараз «дырэктар» другога хромавага цэху т. Шымчак на ходзіць у заводакіраўніцтва, як раней, за парадай або кіраўніцтвам, па кожным дробным пытаньні. Разам з грамадзкасьцю заводу яны шукаюць і знаходзяць шляхі да паляпшэньня работы цэху. ГАСПАДАРЧЫ РАЗРАХУНАК ПРЫМУШАЕ АДНОСІЦЦА ДА ВЫТВОРЧАСЬЦІ ГАСПАДАРНА.

Расстаноўка людзей робіцца больш уважліва, удумліва. Адносіны да матэрыялаў і машын значна палепшыліся. Дагавор з рамонтным цэхам два магчымасьць заўсёды атрымаць слясара або мэханіка для своячасовага рамонту.

Што было раней у сушылцы? Часамі скуры перадаваліся ў райкому недасушанымі. Былі выпадкі, калі скуры валяліся па два тыдні ў яміках і псаваліся. Старэйшы брыгадзір т. МІРУЦЬ ня ведаў, што ён у брыгадзе аўладаецца адміністратарам. Яму аб гэтым ніхто не гаварыў. Цяпер т. Міруць быў начам брыгадзірам і ўявіў сабе значэньне гаспадарчага разрахунку, ён адразу узяўся за ўзмацненьне вытворчай дысцыпліны.

Зараз сушылка працуе добра.

ГАСПАДАРЧЫ РАЗРАХУНАК, ВЫКЛІКАЮЧЫ БОЛЬШ ВЫРАЗНУЮ РАБОТУ, ДАЎ ШТУРШОК ДЛЯ ДАЛЕЙШАГА ЎДАСКАНАЛЕНЬНЯ ПРАЦЭСАЎ ВЫТВОРЧАСЬЦІ. Афарбаваньне хромавых скур ручным спосабам было заменена шпрыцапаратам. Эканомія штомесячна складе 700 руб. Замест пераноскі скур ад аднаго варштату да другога нападзілі перавозку гэтых скур). Цяпер рабочыя самі дзівяцца, як яны да такой простай рэчы раней не дадумаліся.

Зараз т. Шымчак аб мінулай рабоце цэху гаворыць так:

— Я ўвесь час адчуваў, што можна выканаць прамфінплян. А працавалі мы дрэнна. Пачалі капацца ў прычынах і сярод многіх прычын убачылі адсутнасьць гаспадарчага разрахунку, сваю чэздольнасьць працаваць, няздольнасьць арганізаваць масы. А калі мы ў гэтым упэўніліся і пайшлі да рабочых, пачалі непш кіраваць інакш загаварылі варштаты, нават вагаэткі бягуць вясёлей.

Шмат зроблена цэхам. ГАСПАДАРЮЫ РАЗРАХУНАК АКАЗАЎ ВЯЛІКУЮ ДАПАМОГУ ЎДАРНІКАМ. Але шмат яшчэ трэба зрабіць. Ёсьць яшчэ прагульшчыкі, рвачы. Слаба працуе культсэктар заўкому, які не вядзе растлумачальнай работы аб значэньні гаспадарчага разрахунку.

— Усё-ж вызначаных тэмпаў ім не зтрымаць, — гаворыць упэўнена т. Шымчак.

— Ну, а зводку выкананьня прамфінпляну за 10 дзён кожна атрымаць у канторы, — сказаў на разьвітаньне т. ШЫМЧАК.

У канторы зрабілі падлік. 100,19 проц. ВЫКАНАНЬНЯ ПРАГРАМЫ Ў КОЛЬКАСНЫМ АЗНАЧЭНЬНІ І 124, 31% ВЫКАНАНЬНЯ Ў ЦЭННАСНЫМ АЗНАЧЭНЬНІ. Запазычанасьць мінулых месяцаў ліквідавана на 72,64 %.

— ЛЕПШЫ НАГЛЯДАЛЬНІК І АРГАНІЗАТАР ВЫКАНАНЬНЯ ПРАМФІНПЛЯНУ — ГЭТА ГАСПАДАРЧЫ РАЗРАХУНАК, КАНТРОЛЬ РУБЛЁМ. ЕН ПРЫМУШАЕ ГАСПАДАРНІКАЎ УДУМЛІВА КІРАВАЦЬ ВЫТВОРЧАСЬЦЮ, — ТАК КАЖУЦЬ РАБОЧЫЯ ЗАВОДУ «БАЛЬШАВІК».

А. МАЦЬКОЎ.

Самастрахоўка тав. Брэнэйзіна

Ня гледячы на выразныя дырэктывы партыі і ўраду аб пераходзе на гаспадарчы разрахунак і аб тэрмінах заключэньня дагавораў, дырэктар друкарні імя Сталіна тав. Брэнэйзін гармозіць гэту справу.

Ужо два тыдні цягнуцца перагаворы, аб заключэньні дагавору на друкаваньне часопісі «Бел. работніца і сялянка». Рэдакцыя палкам прыняла ўсе умовы, прад'яўленыя друкарняй, і матар'яльную адказнасьць за іх. Але тав. Брэнэйзіну не падабаецца двухбаковае абавязацельства і ён упосіць у дагавор пункт аб тым, што друкарня абавязуецца надрукаваць часопіс за дзесяць дзён і ўплачвае 10 проц. наўстойкі ў выпадку парушэньня гэтага тэрміну... пасьля 3-х ільготных дзён. Каб прымусіць рэдакцыю падпісаць гэты дагавор адміністрацыя пагражала спыніць друкаваньне першамайскага нумару. Больш таго, калі рэдакцыя 30-IV прыслала матар'ял для набору № 13 часопісі, тэхн. кіраўнік таварыш Канановіч адмовіўся прыняць яго, матывуючы непадпісаньнем дагавору, а тав. Брэнэйзін заявіў: «вы спазьніліся здаць матар'ял». Калі-ж ён убачыў, што застаецца яшчэ 15 хвілін для здачы, ён знайшоў, новы матыў—матар'ял кепска надрукован. (Да рэчы, матар'ял быў прызнан кампэтэнтнымі таварышамі здавальняючым).

Тав. Брэнэйзін ня хоча зразумець, што патрабаваньне ільготных дзён зьяўляецца на чым іншым як апартуністычнай самастрахоўкай. Калі ён убачыў, што ільготныя дні ня будуць прыняты, ён патрабаваў павялічыць тэрмін друкаваньня з 10-ці да 12 дзён, тлумачыў у скрытым выглядзе патрабуючы тых-жа «страхавых дзён». Упартасьці тав. Брэнэйзіна не магло зламіць нават заключэньне камісіі, вылучанай парткалектывам друкарні, якая ўстанавіла, што для друкаваньня часопісі патрэбна максымальна 10 з паловай—11 дзён. І да гэтага часу Брэнэйзін не згаджаецца падпісаць дагавор. Гэты факт сыгналізуе, што ў друкарні ня ўсё добра з пераходам на гаспадарчы разрахунак; труднасьці з заключэньнем дагавораў гаворыць аб тым, што друкарня не падрыхтавана да пераходу на гаспадарчы разрахунак і што ў рабоце друкарні пануе бясплянавасьць.

Г. Р.

ВЯСЕНЬНЯЯ СЯЎБА— палітычны экзамэн для вясковых партарганізацый

Выкараняць апартуністычную практыку! Даваць бязьлітасны адпор супраціўленьню кулацтва!

Усе сілы партыйных і камсамольскіх арганізацый на выкананьне праграмы другой калгаснай вясны

Бальшавіцкім кіраўніцтвам забясьпечыць выкананьне плянаў сяўбы

Па канкрэтных выніках работы ў выкананьні задач другой калгаснай вясны, па дасягненьнях калектывізацыі, правільнай арганізацыі працы ў калгасах, па выкананьні ўсіх задач, зьвязаных з веснавой пасеўнай кампаніяй трэцяга рашаючага году зацьвяцца баяздольнасьць партарганізацый, кожнай паасобнай ячэйкі змагацца за практычнае ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі.

Зараз слуба ўвайшла ў рашаючы пэрыяд. Палявыя работы—у поўным разгары. Арганізаваны і добра падрыхтаваны выхад на палявыя работы саўгасаў, калгасаў і МТС, эфэктыўнасьць калектыўнай працы на буйных аграмаджаных гаспадарках—арганізуючым фактар нарастаньня калгаснага прыпліву, зарука пасьпяховага правядзеньня сяўбы.

І наадварот, там, дзе былі дапушчаны ў падрыхтоўчай рабоце прабелы, дзе пераважаў самацёк у гэтай важнейшай справе, там ужо з першых крокаў работы па сяўбе рэзка адчуваюцца хібы, нагледаецца адставаньне, адгэтуль і пагроза недавыкананьня плянаў.

З МСЬЦІСЛАЎСКАГА і інш. раёнаў сыгналізуюць, што некаторыя калгасы не стварылі да гэтага часу поўнасьцю насенных фондаў, ёсьць такія калгасы, якім не паказаны тлошчы яравога кліну. Сяўба пачалася, а дзе і што сеяць калгасы ня ведаюць. Ня ўсюды ўведзена зьдзельшчына, якая зьяўляецца важнейшым стымулям узьнящцця прадукцыйнасьці працы ў калгасах.

Клясавы вораг ня дрэмле. Кулацкія элемэнты хватаюцца за факты прарываў і недахопаў у рабоце калгасаў, якія (недахопы) стваравоцца ў выніку слабога кіраўніцтва з боку некаторых парт'ячэек, і імкнуцца ў сваёй варожай агітацыі супроць калгаснага будаўніцтва вытлумачыць гэтыя недахопы як натуральную ўласьцівасьць калгасаў. І вось там, дзе няма непажага адпору гэтай агітацыі і рашучага націску на кулака, дзе парт'ячэйкі слаба праводзяць масавую работу сярод калгасьнікаў, беднаты і сераднякоў—адназасобнікаў, дзе пануе бязьдзейнасьць, апартуністычны самацёк, там прарывы ў рабоце. У такіх выпадках кулацтва дасягне сваёй мэты—развалу паасобных калгасаў.

Шапёная актывізацыя кулацкіх элемэнтаў супроць усіх мерапрыемстваў па сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі абавязвае партарганізацыі павялічыць клясавую пільнасьць, узмацніць барацьбу з апартунізмам ва ўсіх яго праявах, шырэй разгарнуць работу ў вёсцы па мабілізацыі мас на бязьлітасную барацьбу з кулацтвам.

Раённыя партарганізацыі і ячэйкі, забясьпечваючы выкананьне плянаў другой бальшавіцкай вясны, павінны больш КАНКРЭТЫЗАВАЦЬ сваё кіраўніцтва работай калгасаў, шчыльней падыйсьці да задач правільнай арганізацыі працы ў іх, пераводзячы гэту працу на рэйкі сацспаборніцтва і ўдарніцтва, выпрацоўць на-ходу ўсе недахопы. Разам з гэтым трэба шырока выкрываць перад калгасьнікам і бядняцка-сераднякім сялянствам рознастайныя мэтады барацьбы клясавага ворага, даючы фактам гэтай барацьбы належную палітычную ацэнку, арганізуючы масы на бязьлітасную барацьбу з кулацкімі элемэнтамі, на барацьбу з усякімі спробамі гэтых элемэнтаў перашкодзіць пераможнаму сацыялістычнаму наступленьню.

На хаду ліквідаваць прарывы

Мсьціслаўская раённая партарганізацыя за апошнія 3-4 месяцы дабілася значных посьпехаў у справе калектывізацыі. Зараз у раёне калектывізавана 40 проц. бядняцка-сераднякіх гаспадарак. Паасобныя сельсаветы блізкі да суцэльнай калектывізацыі. Калгасы ў сваёй большасьці вышлі на палявыя работы ў поўнай меры падрыхтаванымі і з посьпехам праводзяць веснавую сяўбу. Арганізаваны выхад у поле калгасаў станоўча спрыяў на новы калгасны прыліў. Хваля калгаснага прыліву нарастае і зараз асабліва ў тых сельсаветах, дзе па-бальшавіцку разгорнута работа партыйных ячэек, дзе ў калгасах правільна арганізавана праца, дзе мабілізаваны калгасныя і адназасобныя бядняцка-сераднякія масы на бязьлітасную барацьбу з кулацтвам.

Разам з тым у радзе парт'ячэек наглядаецца недапушчальная бязьдзейнасьць, фармальныя адносіны да задач калектывізацыі і веснавой сяўбы, яўная правапартуністычная практыка. Так, напрыклад, Хадасаўская парт'ячэйка ня здолела арганізаваць калгасных бядняка-сераднякіх мас на барацьбу супроць варожай агітацыі кулацтва. У вёсцы Лапаніца кулакі адкрыта праводзяць агітацыю супроць калгасаў, супроць кантрактацыі і наогул супроць выкананьня плянаў сяўбы. Гэта агітацыя не сустракае належнага адпору. Праведзеная работа ў сельсавеце па калектывізацыі, засталася бяз вынікаў. Нядаўна арганізаваныя там тры калгасы разваліліся з тае прычыны, што парт'ячэйка і сельсавет не аддавалі ніякай увагі гаспадарчаму замацаваньню гэтых калгасаў і арганізацыі працы ў іх. Прычынай для развалу гэтых калгасаў у значнай меры зьявілася яшчэ і тое, што кіраўніцтва хадасаўскай парт'ячэйкі лениніскія прынцыпы добраахвотнасьці ў калгасным будаўніцтве часамі падмяняла наскрозь варожымі партыйнай лініі «лявацкімі» перагібамі, адміністраваньнем калгаснага руху.

У рабоце па калектывізацыі ў значнай колькасьці парт'ячэек быў адхабаковы падыход: арганізаваўшы новыя калгасы не зварачалася ніякай увагі на іх замацаваньне. Не ва ўсіх калгасах яшчэ засыпаны насенныя фонды, а дзе выпадкаў наглядацца недапушчальнае конскай цягавай сілы. У паасобных калгасах на аднаго каня прыпадае апрацаваць 8-9 гэкт. Гэта норма досыць напружаная, а належнага догляду за коньмі няма.

Праца ў большасьці калгасаў пераведзена на зьдзельшчыну. Адпак, у гэтай справе ёсьць фармальны падыход. Кіраўніцтва калгасаў уводзіла зьдзельшчыну ня зыходзячы з канкрэтных умоў, а мэханічна пераносіла прыкладныя нормы выпрацоўкі Белкалгаспэнтру, у той час, калі на радзе галіны работы ў многіх калгасах ёсьць магчымасьць павялічаньня гэтых норм, а ў некаторых выпадках бязумоўна патрэбна некаторае і вымяншэньне. Вельмі кепска тое, што адпаведныя органы не забясьпечылі да гэтага часу афармленьня яравога кліну над калгасы. Гэта вялізарнейшая перашкода ў правядзеньні сяўбы.

Для зьнішчэньня ўсіх гэтых недахопаў райком КП(б)Б мабілізаваў увесь партыйны, камсамольскі і прафсаюзны актыў. Мабілізаваныя таварышы выехалі на месцы. Прарывы, дапушчаныя ў калгасным будаўніцтве і падрыхтоўцы да веснавой сяўбы павінны быць неадкладна ліквідаваны.

Я. М.

ПЕРАКЛЮЧЫЛІСЯ

Кубліцкі сельсавет зьяўляўся найбольш адсталым у Вушацкім раёне ў справе калектывізацыі і выкананьня чарговых гаспадарча-палітычных кампаній. Прычына такога становішча заключалася ў тым, што парт'ячэйка не праводзіла належнай масавай работы ў сельсавеце. Сакратаром ячэйкі быў Кабян, яўны апартуніст, які скажаў дырэктывы партыі. Апартуністычнае кіраўніцтва ячэйкі прывяло да зрыву ў сельсавеце раду важнейшых гаспадарчых кампаній, а калектывізацыя праходзіла выключна самацёкам. Пасьля таго, як паводле пастановы Вушацкага РК, кіраўніцтва гэтай ячэйкі было зьнята і адбыліся перавыбары бюро ячэйкі, адразу вызначыўся пералом у рабоце. Ячэйка пераключылася на бальшавіцкія тэмпы работы.

Усю сваю ўвагу ячэйка сканцэнтравала на задачах калектывізацыі і шырока разгарнула работу ў гэтым напрамку сярод бядняцка-сераднякіх нас вёскі. Бальшавіцкая работа дала свае вынікі. За параўнальна кароткі тэрмін процант калектывізацыі ў сельсавеце павялічыўся з 13 да 40. Новыя калгасьнікі з узьнятым энтузіязмам узяліся за выкананьне плянаў веснавой сяўбы.

Я. Ліпаўка.

Аб разгортваньні сацспаборніцтва і ўдарніцтва ў сувязі з веснавой сяўбой і правядзеньнем конкурсу ў межах прыгараднага раёну

ПАСТАНОВА БЮРО МЕНСКАГА ГАРКОМУ КП(б)Б

1. На падставе пастановы ЦК КП(б)Б правесьці з 10 мая агляд разгортваньня сяўбы, становішча і сацспаборніцтва і ўдарніцтва і арганізацыю конкурсу на лепшае правядзеньне 2-й бальшавіцкай вясны.

2. Даручыць вясковым парткомам, саўгасным, калгасным і сельсавецкім парт'ячэйкам шырока папулярызаваць у масах калгасьнікаў і саўгасьнікаў справу конкурсу, яго ролю і значэньне ў правядзеньні сяўбы шляхам шырокага абгаварэньня на сходах, зьпётах, у часе абедзенных перапынкаў на полі і пралам пеньня гэтага на практыцы ва ўмовах сваёй гаспадаркі на прадмет укліочэньня ў апошні.

3. Даручыць парткомам і ячэйкам прадпрыемстваў і ўстаноў г. Менску забясьпечыць шырокае растлумачэньне аб значэньні конкурсу ў саўгасах і калгасах па лініі шэфства, а таксама арганізацыю дапамогі людзкой сілай.

4. Даручыць упаўнаважаным гаркому КП(б)Б на час сяўбы па сельсаветах дапамагчы ў практычным праламленьні на месцы гэтага вялікага мерапрыемства.

5. Мясцовым ячэйкам па лініі хат-чытальнэ, нарадамоў, чырвоных куткоў у калгасах і саўгасах шырока асьвятліць гэту справу ў насьценгазэтах, там дзе ёсьць шматтыражка — у шматтыражным друку.

6. Даручыць парт'ячэйцы райпалгасаюзу вышукаць унутраныя калгасныя фонды па калгасах для прэміяваньня лепшых ударнікаў у правядзеньні работы ў часе сяўбы.

7. Для кіраўніцтва гэтай работай стварыць штаб у складзе т.т. Карнаўчэнка (старшыня штабу), Янубовіча, Хоньки, Фрыдмана (ГК ЛКСМБ), Шкірыча і Мацеліцы, якому даручыць правядзеньне ўсёй штодзённай работы ў гэтай галіне.

Зьняць апартуністаў з кіруючых пастоў

Рабочая брыгада майстэрань шляху Заходніх чыгунак правяла абсьледваньне работы калгасу, які арганізован яшчэ ў мінулым годзе ў вёсцы Борхава, Уваравіцкага раёну. Абсьледваньне паказала, што гэты калгас знаходзіцца ў стане заняпаду. Справа ў тым, што кіраўніцтва калгасу ўвесь час праводзіла ў сваёй рабоце правапартуністычную лінію, ігнаравала ўсю работу ў калгасе, дзейнічала ў цесным сувязі з кулацкімі элемэнтамі. За гэта кіраўніцтва калгасу на чале з старшынёю праўленьня аддана пад суд. Раённае кіраўніцтва ўжыло нечаторныя задачы да аздараўленьня становішча ў калгасе, але не давяло справы да канца. Для ўзмацненьня работы ў калгасе былі пераведзены з лепшых арцеляй калгасьнікі актывісты, якія набылі ўжо значны вопыт па працы ў калгасах. Гэты актыў не знайшоў належнага падтрыманьня ў сваёй рабоце і дапамогі з боку парт'ячэйкі. Парт'ячэйка, якая павінна кіраваць гэтым калгасам, бязьдзейнічае. Кіраўніцтва ячэйкі ў асобе сакратара Янушоваў упала ў пасьмішэ і, замест работы на аздараўленьні становішча ў калгасе, прапагандуе правапартуністычныя погляды. Апартуністка Якушова ўносіць прапановы... разагнаць калгас. Кулацкія элемэнты пры такіх умовах беспакарана праводзяць сваю варожую дзейнасьць супроць калектывізацыі.

Так борхаўскія апартуністы хацелі калгас да развалу. 24 гаспадаркі з калгасу выйшлі, а засталіся адзінкі. Памылка Уваравіцкага райкому КП(б)Б заключаецца ў тым, што, рэагуючы на кулацкую палітыку былога праўленьня калгасу, не зацікавіўся станам работы парт'ячэйкі, і нічога ня ўжыў для выкарчоўваньня там правапартуністычнай практыкі.

Брыгада: Сідарэвіч, Подальскі, Анісімава, Данькінава, Мехаеа, Ермакова.

О. МАЦЬЯС

Завочнае навучаньне—у сыстэме падрыхтоўкі кадраў

Задача, пастаўленая камуністычнай партыяй перад краінай Саветаў, — у пятарычна мінімальны тэрмін дагнаць і перагнаць перадавыя капіталістычныя краіны ў тэхніка-эканамічных адносінах — патрабуе максымальнай увагі ўсёй савецкай грамадзкасьці да справы падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі пралетарскіх кадраў і ліквідацыі культурна-тэхнічнай адсталасьці працоўных.

Паводле арыентовачнага падліку Дзяржпляну па адной толькі сельскай гаспадарцы патрабуецца на бліжэйшыя 1932-33 гады спэцыялістаў па вышэйшай кваліфікацыі каля 7 тыс. асоб. у тым ліку агранамаў-сьпінаводаў — 850, зоатэхнікаў па буйной рагатай жывёле — 900, зоатэхнікаў па сьвінагадоўлі — 900; па сярэдняй кваліфікацыі патрабуецца каля 24 тыс. чалавек, у тым ліку тэхнікаў-пльнаводаў — 1.040, зоатэхнікаў па буйной рагатай жывёле — 2.800, па сьвінагадоўлі — 1.850, па масавай кваліфікацыі патрабуецца звыш 134 тысяч чалавек, з іх толькі адных трактарыстаў — 48 тыс. Зараз мы і паловы гэтага ліку спэцыялістаў ня маем.

Для папаўненьня сацыяльна-пэдагагічных кадраў, апарата існуючых, патрабуецца каля 3.600 чалавек вышэйшай кваліфікацыі і 21.400 чалавек — з сярэдняй кваліфікацыяй.

Але ня гледячы на вялікія патрабаваньні пэрыяду сацыялістычнай рэканструкцыі народнай гаспадаркі на кваліфікаваную рабочую сілу, падрыхтоўка кадраў да гэтага часу не наладжана, вельмі кепска стаіць справа з курсавой і асабліва заочнай сыстэмай падрыхтоўкі кадраў. Нагледаецца недапушчальная недаацэнка заочнага навучаньня, недаацэнка яго ролі ў справе падрыхтоўкі кадраў з боку раду цэнтральных устаноў БССР (ВСНГ, Наркамзем, Белкаапсаюз, Наркамасьветы).

Наркамазем у мінулым годзе атрымаў ад Наркамасьветы калгасны ўнівэрсытэт з кантынгентам у 830 заочнікаў і пачаў рэарганізаваць яго ў філіял заочных курсаў пры Калгасцэнтры СССР з кантынгентам у 3.500 асоб. Да правядзеньня гэтай рэарганізацыі курсы былі распушчаны, а рэарганізацыя і на сёньняшні дзень яшчэ ня скончана. Камплектаваньне вядзецца такімі «спаркімі тэмпамі», што зараз ёсьць толькі 70 залі аб прыёме.

Ня лепш справа стаіць і ў Наркамасьветы. Па заочным падтэхнікуме плянам вызначана 1.030 чал., а прынята толькі 406; па рабфаку замест 3 тыс. асоб прынята толькі 431 чал. і г. д.

Такі-ж малюнак мы назіраем і ў тых установах, якія ня маюць сваіх самастойных заочных устаноў, а атрымліваюць вызначаныя кантынгенты ад цэнтру. Напрыклад, Белкаапсаюзу было прадстаўлена Цэнтрасаюзам 165 месц па ўсіх відах спэцыяльнасьцей, але не запоўнена і паловы гэтых месц. Маскоўскі інстытут тэхналёгіі збожжа і мукі вызначыў Белкаапсаюзу 50 месц, а запоўнена толькі 2 і г. д.

Сацыяльны склад слухачоў заочных устаноў вельмі нездавальняючы. Па радыё-унівэрсытэту рабочых 5,5 проц., калгасьнікаў — 18 проц., працуючых на аднаасобных гаспадарках —59 проц.; Па падтэхнікумах — рабочых 6 проц., сялян без падзелу на беднякоў і сераднякоў — 50 проц

ВЫШЭЙ ТЭМПЫ БАЛЬШАВІЦКАЙ СЯЎБЫ

ПЛЯНЫ СЯЎБЫ ПАВІННЫ БЫЦЬ ВЫКАНАНЫ І ПЕРАВЫКАНАНЫ

Да суровай адказнасьці вінаватых у скарачэньні яравога кліну на 20 тыс. га па 10 раёнах. Пакласьці канец такім мэтадам апартуністаў сарваць праграму другой бальшавіцкай вясны

Неадкладнае ўкараненьне зьдзельшчыны і разгортваньне ўдарніцтва на палёх—лепшы спосаб ушчыльненьня тэрмінаў сяўбы—руйнуючы ўдар па апартуністах і кулаках

Узьняць ураджайнасьць ільну

Змагацца ня толькі за колькасьць, але і за якасьць —галоўная задача другой каласнай вясны

У справе пашырэньня ільнаводзтва ў БССР на сёньняшні дзень мы маем значныя посьпехі.

Ужо ў 1925 годзе мы перавысілі дарэвалюцыйны разьмер пасеўных плошчаў ільну і, такім чынам, скончылі перыяд аднаўленьня.

У 1930 ГОДЗЕ ПАСЕЎ ІЛЬНУ Ў БССР ДАСЯГНУЎ 134 ТЫС. ГЭКТ., ШТО СКЛАДАЕ 142 ПРОЦ. ПЛОШЧЫ 1916 ГОДУ.

У 1931 годзе на базе арганізацыі буйных спэцыялізаваных ільнаводчых саўгасаў, на базе ўзбуйненьня с.-г. вытворчасьці, шляхам аб'яднаньня дробных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак у спэцыялізаваныя калгасы, на базе будаўніцтва 46 ільназаводаў і мэханізацыі найбольш працаёмкіх працэсаў гадоўлі культуры ільну (арганізацыя МТС у 15 ільнаводчых раёнах, завоз у БССР 654 шт. ільнацеябалак і 320 штук машын для абчосваньня ільняных галовак)—мы маем магчымасьць СТАРЫЦЬ ПЕРАЛОМ У СПРАВЕ ільнаводзтва ў бок павялічэньня тэмпаў яго разьвіцьця. У 1931 годзе ільном будзе засеяна 240 тыс. гэкт.

Але побач з гэтымі дасягненьнямі ў галіне колькаснага пашырэньня ільнаводзтва ёсьць значны прарыў у якасных паказальніках. Паводле даных эканоміка-статыстычнага сэктару Дзяржпляну, у 1930 годзе ўраджайнасьць ільнавалакна з 1 гэктара складае 2 цэнтнэры, прычым за апошнія 5 год пічба заставецца амаль стабільнай.

Па ўраджайнасьці ільну мы яшчэ не дасягнулі паказьнікаў дарэвалюцыйнага часу і таму можна сказаць, што па гэтай аднасьцы мы яшчэ знаходзімся ў стадыі аднаўленьня ільнаводзтва. Гэта становішча нельга кваліфікаваць інакш, як значным прарывам у справе разьвіцьця ільнаводзтва, на ліквідацыю якога (прарыву) патрэбна мінуць зараз-жа ўсе сілы і сродкі.

У парадку сёньняшняга дня неабходна паставіць пытаньне аб павышэньні ўраджайнасьці ільну. Пара ўжо пераключыцца на барацьбу ня толькі за колькасныя паказальнікі пашырэньня ільнаводзтва, але і за якасныя.

Нельга ні на адну хвіліну забываць, што намі ўзят курс на тое, каб дагнаць і перагнаць перадавыя ў тэхнічных адносінах краіны, а на сёньняшні дзень мы маем ураджайнасьць ільнавалакна ў 4-5 раз меншую супроць краін з высокай тэхнікай ільнаводзтва.

Трэці рашаючы год пяцігодкі павінен быць ня толькі годам пераломам ў справе пашырэньня пасеўных плошчаў ільну,—у гэтым годзе павінен быць забясьпечан і разваротны пералом у павышэньні ўраджайнасьці.

Пастанова калегіі Народнага Камісарыяту Зямляробства БССР аб ужываньні прасьцейшых агратэхнічных мерапрыемстваў па павышэньні ўраджайнасьці ільну і канапель павінна быць прапрацавана на агульных сходах рабочых саўгасаў, калгасьнікаў і бядняцка-серадняцкага сялянства.

Шляхам ажыцьцяўленьня сталінскага пёзунгу: «Тэхніку—у масы, шляхам шырокага ўжываньня агрэмініму па ільне ў саўгасах, калгасах і бядняцка-серадняцкіх гаспадарках забясьпечым сацыялістычную тэхстыльную прамысловасьць ільнасырцом.

Змагацца за якасьць—вось задача сёньняшняга дня.

І. М.

Безадкладна арганізаваць дапамогу

МАЛАМОЦНЫМ КАЛГАСАМ

Не дапусьціць пагоршаньня якасьці ўраджаю

ВУЛА. (Наш кар.). Ня гледзячы на сыгналы «Зьвязды» пытаньне цягавай сілы ў калгасах **ВУЛЬШЧЫНЫ** дагэтуль яшчэ ня вырашана.

Большасьць калгасаў скончыла ворыва, разгортвае масавую сяўбу гароху, аўса, ячменю і інш. культур, а некаторыя калгасы ня могуць скончыць ворыва з-за недахвату цягавай сілы.

У калгасе **«ЗЬВЯЗДА»**, з прычыны недахвату коняй, пагаршаецца якасьць апрацоўкі зямлі. Так, гарох сеюць проста па іржышчы, а потым заворваюць. Гэта — горшы спосаб ушчыльненьня сяўбы.

Калгас **«ЗАРА ЗАХАДУ»**, спасылаючыся на «аб'ектыўныя» ўмовы (дрэнны стан коняй), зьмяншае нормы выпрацоўкі.

Усё гэта прыводзіць да таго, што ў некаторых кіраўнікоў калгасаў ёсьць імкненьне прадоўжыць тэрміны сяўбы да 10-15 чэрвеня.

Старшыня райкалгассаюзу Барадулін заяўляе, што ніяк не ўдаецца зрабіць перакідку коняй з аднаго калгасу ў другі. Гэта ў той час, калі адны калгасы маюць нагрузку на каня 4 з палов. гэктары пахаці, а другія—7-8 гэкт.

Перад раённымі арганізацыямі стаіць задача безадкладна выправіць гэтыя недахопы і скончыць сяўбу не пазьней 30-га мая.

Неабходна кінуць на дапамогу маламоцным калгасам тых коняй, якія ёсьць у самой Вуле ў карыстаньні раённых устаноў.

МІКУЦКІ.

5 сельсаветаў чакаюць насеннай дапамогі

Слова за Наркамземам

ЛОЕЎ. (Наш кар.). Па 12 сельсаветах Лоеўшчыны разгарнулася масавая сяўба. **КРУПЕЙКАЎСКІ** сельсавет на 10 мая ўжо засеяў звыш 50 проц. яравога кліну. У гэтым сельсавеце ўжо засеяна 370 га бульбы, 33 га ільну і 36 га ячменю. Партыйная ячэйка паставіла перад сабою задачу да 20 мая скончыць сяўбу па ўсім сельсавеце.

Яравы клін пяці сельсаветаў, якія знаходзяцца на другім беразе ракі, яшчэ затоплен. Райвыканкомам прымаюцца меры да аказаньня насеннай дапамогі тым сельсаветам, якія папярэлі ад паводкі. Аднак, з боку Наркамзему гэтым сельсаветам ніякай дапамогі пакуль што не аказана.

За лепшае правядзеньне сяўбы райвыканкомам вызначаны тры прэміі. Райкалгассаюз таксама вызначыў прэміі за лепшую арганізацыю зьдзельшчыны.

М. Р.

У адказ тулякам

500 гаспадарак уступілі ў калгасы

КРЫЧАЎ. Пасьля раённага зьлёту калгасьнікаў, які ў адказ тульскім рабочым прыняў на сябе рад абавязацельстваў, у раёне дасягнуты значныя посьпехі ў галіне калектывізацыі.

За апошні час арганізавана 6 новых калгасаў. У калгасы ўступіла 500 бядняцка-сераднякіх гаспадарак. 48,1 проц. гаспадарак раёну аб'яднаны ў калектывах. У пасобных сельсаветах, як Бацьвінаўскім калгасы яднаюць 98 проц. гаспадарак і Баяўскім—90 проц.

31 калгас раёну ўжо скончыў ворыва і прыступіў да сяўбы раньніх культур. Больш моцныя калгасы дапамагаюць маламоцным і новаарганізаваным. Так, калгас «ДНІ ЛЕНІНА» ўзяраў падшэфнаму калгасу 7,5 га.

Папярэдняя праверка правядзеньня зьдзельшчыны паказвае, што ў радзе калгасаў зьдзельшчына існуе на паперы, фактычна-ж работа вядзецца на асновах падзёнчыны. Тлумачыцца гэта тым, што калгасным масам яшчэ не растлумачана як сьлед значэньне зьдзельшчыны і прынцыпы яе ўжываньня на практыцы.

Ударная брыгада «Зьвязды»:
В. БУНТАР І В. АНЭТ.

ЗЛАМАЦЬ АПАРТУНІСТЫЧНУЮ СЬЦЯНУ

ПЛЯНЫ ДРУГОЙ БАЛЬШАВІЦКАЙ ВЯСНЫ ПАВІННЫ БЫЦЬ ВЫКАНАНЫ ПОЎНАСЬЦЮ І Ў ТЭРМІН

На старонках «Зьвязды» ня раз выкрывалася апартуністычная практыка раду раённых арганізацый БССР, якія прабавалі скарачаць пасеўныя пляны асабліва тэхнічных культур.

Ня гледзячы на катэгарычную дырэктыву ЦК КП(б)Б і СНК БССР аб недапушчальнасьці зьмяншэньня плянаў на севу тэхнічных культур, скарачэньне плянаў пасеву ўсё-ж ня спыняецца.

Толькі ў апошнія дні выяўлена, што па 10 раёнах пасеўная плошча зьменшана на 20 тыс. гэкт. у параўнаньні з плянам.

Уваравіцкі раён, замест прысылкі раённага пляну сяўбы ў лютым, прыслаў плян толькі 6 мая пасьля дзесятка катэгарычных тэлеграм. Пры зьверцы плянаў выявілася, што раённыя арганізацыі зьменшылі плян сяўбы на 7 тыс. гэкт., у тым ліку на 1.000 гэкт. тэхнічных культур. Апартуністычны плян даведзен да калгасу і двара, паводле гэтага пляну фактычна праводзіцца сяўба.

На неаднаразовыя катэгарычныя дырэктывы Наркамзему прыняць плян поўнасьцю раённыя арганізацыі не адказваюць. Паўднёвы раён Уваравічы да 20 мая павінен быў скончыць сяўбу. Уваравіцкія апартуністы стараюцца зацягнуць адказ, выкарыстаўшы час да канца сяўбы.

У гэтым-жа раёне знаходзіцца прадстаўнік Наркамзему тав. Кінэрвацц, якому яшчэ 8 мая Наркамзем прапанаваў дабіцца прыняцьця пляну. Гэты гора-прадстаўнік таксама ўсё маўчыць.

Апартуністы Цярахаўскага райвыканкому і райга, зьнізіўшыя пляны сяўбы на 2 тыс. гэкт., перавысілі ўсе межы галавацтва. На катэгарычную прапанову Наркамзему прыняць плян сяўбы поўнасьцю райвыканком адказаў бюракратычнай двусэнснай адпіскай. Ухіляючыся ад простага адказу ў сваім лісьце, райвыканком запэўніе Наркамзем, што «плян будзе выкананы за лік павялічэньня пасеўнай плошчы пасобнымі калгасамі і аднаасобнікамі» (сустрэчныя пляны). А член калегіі Наркамзему БССР—тав. Шчарбакоў, які зна ходзіцца ў раёне, абыйшоў моўчкі факт скарачэньня плошчаў. На тэлеграму наркамзема т. Рачыцкага аб прыняцьці мер на месцы па выпраўленьні памылак раёну, які дапусьціў скарачэньне плошчаў, Шчарбакоў упарта не адказваў.

Менскі прыгарадны раён зьнізіў плян сяўбы на 2.800 гэкт., у тым ліку на 500 гэкт. тэхнічных культур. «Спэцыялісты» з райга ўсяляк стараюцца даказаць, што няма «зямлі». Моў, пальцамі перамерылі ў той час, як паводле даных Наркамзему ў раёне ёсьць яшчэ вялікая колькасьць няўлічанай зямлі.

Характэрныя паводзіны апартуністаў з Касьцюковіцкага раёну. Паводле пляну раён павінен засеяць 6.500 гэкт. ільну, раённыя арганізацыі выкрэсьліваньнем пяра зьменшылі плян на 3.500 гэкт. Пасьля катэгарычнай прапановы Наркамзему аб неадкладным прыняцьці пляну пасеву ільну райвыканком адказаў: «плошча будзе павялічана». Завезенае насеньне ільну для пасеву раённыя арганізацыя расклалі, выходзячы са свайго апартуністычнага пляну, а рэшта 200 тон насеньня ляжыць бяз руху на складзе.

14 мая ў тэлеграме на імя наркамзема прадстаўнік Белхлебжывёлазаву, які знаходзіўся ў Касьцюковічах, піша:

«Замест прадугледжанага пасеўным плянам завозу 50 тон ільнанасеньня, на сёньняшні дзень завезена 250 тон, прашу ўказаньняў, куды адгрузіць непатрэбныя 200 тон насеньня, інакш 14-га яны будуць пасланы Магілеўскаму маслазаводу. Бэнэнсон».

Камэнтары да гэтага лішнія.

Таксама значна скарацілі свае пляны Хойніцкі раён на 2 тыс. гэкт., Чаўускі—на 1.400 гэкт. і інш.

Характэрна адзначыць, што раёны, зьнізіўшыя свае пляны, аб якіх «Зьвязда» пісала ў нумары ад 8 мая, да гэтага часу ня выправілі сваіх ілўна апартуністычных памылак.

Масавая сяўба пачалася. Раёны, скараціўшыя пляны сяўбы, упарта маўчаць, не жадаючы прымаць поўнасьцю пляны і перабудоўвацца на іх выкананьне.

Неабходна зламаць гэту апартуністычную сьцяну.

ЦКК-НК РСІ павінна пакласьці канец апартуністычнай практыцы вышэй прыведзеных раёнаў.

Пляны сяўбы другой бальшавіцкай вясны павінны быць выкананы поўнасьцю і ў тэрмін

Я. Ф-ко.

Алейнік арудуе

Смалявічы. Патрэбна ачысьціць калгас «Камсамольская воля» ад засьмечанасьці антыкалгасным элемэнтам, які дэзарганізуе працу калгасу. Пралезшы ў калгас «Камс. воля», сын кулака Алейнік Адам вядзе разбуральную работу з сярэдзіны. Алейнік сарваў арганізаваны дзень працы ў вялікодныя сьвяты, сам не пашоў працаваць і агітаваў сярод калгасьнікаў за нявыхад на працу ў гэтыя дні.

Алейнік, працуючы ў цясьлярнай брыгадзе, з яўна шкодніцкай мэтай імкнуўся пад фундамант сіласнай вежы падкласьці гнілы матар'ял, кажучы: «гэта не бацькаўшчына».

Далей Алейнік штодзенна імкнецца прышчапіць калгасьнікам свае погляды на калгас, як на нешта чужое. «Колькі не працуй — усё адно з калгасу нічога ня выйдзе» — гэта дэвіз Алейніка.

Алейнік таксама цралез у сакцыю РСІ ў калгасе, і калі калгасная насьпенгазэта занялася выкрыцьцём шкодніцтва Алейніка, апошні падняў паход супроць насьценгазэты, пагражаючы расправіцца з насьценкорам, які адважыўся пісаць аб Алейніку.

Алейнік заяўляў давер'е райулады і калі яму хто пярэчыць, то ён звычайна адказа: «ляваць мне на вас усіх».

Тэрміновая ачыстка калгасу ад варожых элемэнтаў паставіць «Камсамольскую волю» зноў у перадавыя рады змагароў за другую бальшавіцкую сяўбу.

П. А.

КАЛГАС „ДОБРААХВОТНІК" СКОНЧЫЎ СЯЎБУ

БРАГІН. (Наш кар.). Пры райвыканкоме арганізавана камісія па праверцы ходу веснавой сяўбы ў раёне. Камісія заслухала даклад СЬПЯРЫСКАГА сельсавету аб ходзе сяўбы. Веснавая сяўба ў гэтым сельсавеце праходзіць нездавальняюча. Значна адстае індывідуальны сэктар, які на 10 мая засеяў 392 га яравых культур—20 проц. пляну.

Сапраўдныя бальшавіцкія тэмпы паказаў калгас «ДОБРААХВОТНІК», ЯКІ ДАТЭРМІНОВА СКОНЧЫЎ СЯЎБУ ЗБОЖЖАВЫХ КУЛЬТУР. КАЛГАС НА ТРЫ ДНІ РАНЕЙ ЗАСЕЯЎ 80 ГА ЗБОЖЖАВЫХ І 6 ГА ІЛЬНУ. МОЛАТ.

Гарадок павінен скончыць кантрактацыю ў бліжэйшыя-ж дні

ГАРАДОК. (Ад наш. спэц. кар.).

Да другой паловы красавіка кантрактацыя ў раёне вялася без належнай энэргіі. Нармальна ішла кантрактацыя толькі ў калгасах. Па аднаасобным-жа сэктары кантрактацыя галопна адставала. У другой палове красавіка процант выкананьня пляну кантрактацыі ў аднаасобных гаспадарках не перавышаў 20.

Такое становішча тлумачыцца былым злачынным кіраўніцтвам групы правых апартуністаў, якія дапусьцілі невыкананьне абавязацельстваў у адносінах кантрактантаў, што нічым не апраўдваецца. Закантрактаваўшым ураджай тэхкультур ня быў выдан дагаворны хлеб, мануфактура, прамтавары, макуха і т. д. Усё гэта дыскрэдытавала загатоўшчыкаў і дало ў рукі кулаку зброю для антысавецкай прапаганды.

Гэту групу раённых кіраўнікоў зьнялі, аддалі пад суд, але вынікі іх праваапартуністычнага кіраўніцтва даюць сябе адчуваць і зараз.

Новым кіраўніком прышлося мабілізаваць усе сілы для ліквідацыі прарываў ня толькі па кантрактацыі.

У канцы красавіка Гарадоцкі райвыканком вынес пастанову: **закончыць кантрактацыю да 12 мая.**

Для выкананьня гэтай пастановы з месца ў кар'ер былі высунуты сапраўдныя практычныя мерапрыемствы: 1) зараз-жа былі мабілізаваны кадры для работы ў сельсаветах па кантрактацыі, паслана каля 60 чалавек актывістаў; 2) запрошаны ўсе старшыні і члены сельсаветаў для гэтай-жа работы за асобную плату; а самое важнае: узяліся за ліквідацыю леташняй запазычанасьці кантрактантам, каб выбіць з рук кулацкага зброю. Накіравана на месцы 25.000 пудоў хлеба для разьліку за 1930-31 гады. Вылучан з мясцовых рэсурсаў фонд прамтавараў для гэтай-жа мэты.

Результаты гэтых мерапрыемстваў праявіліся хутка: ужо 1 мая процант кантрактацыі вырас да 30, 5-га — да 39,75, 6 8-га—да 48. Гэта паводле даных аформленых дагавораў, а з неаформленым актам, фактычна, закантрактавала каля 65 проц. 50 проц. сельсаветаў ужо закантрактавалі на ўсе 100 проц. Але ёсьць сельсаветы, дзе і зараз уплыў антысавецкага і кулацкага элемэнту моцны і там работа пасоўваецца марудна: Вайхонскі, Канчанскі, Пяншынскі і інш. сельсаветы. Туды мабілізаваны ўсе сілы.

Судзячы па наступаючых зводках, можна разьлічваць, што плян кантрактацыі за мізэрным выключэньнем будзе праведзен поўнасьцю да 14-15 мая.

А. ОРШЫН.

7 дзён прастаялі трактары

Стара-Дароскай МТС

СТАРЫЯ-ДАРОГІ. Па Стара-Дароскім раёне разгарнулася масавая сяўба. Калгасы на 10 мая засеялі 311 га ячменю, аўса і бульбы. Аднаасобнікі засеялі 713 га. Вельмі марудна разгортваецца сяўба ў саўгасах, якія засеялі толькі 22 га.

Яшчэ ня ўсе калгасы раёну перайшлі на зьдзельшчыну. У Пасецкім сельсавеце з 4 калгасаў на зьдзельшчыну перайшоў толькі адзін. Райземаддзел ня ведае, колькі калгасаў перайшло на зьдзельшчыну.

Стара-Дароская МТС яшчэ ня стала вагаром суцэльнай калектывізацыі ў раёне. З прычыны нераспарадчасьці работнікаў МТС трактары прастаялі 7 дзён у самы разгар сяўбы бяз руху. Гаручым трактары таксама не забясьпечаны поўнасьцю. МТС адпускае гаручага на два-тры дні, з прычыны чаго часта бываюць прастоі трактараў. МТС вельмі слаба кідае барацьбу за ўзьняцьце якасьці ўраджаю і за павышэньне ўраджайнасьці. У выніку рад калгасаў ня выканаў пляну вапнаваньня глебы.

За 10 дзён мая ў калгасы раёну ўступіла 195 бядняцка-сераднякіх гаспадарак і арганізован адзін новый калгас.

Гэты факт гаворыць аб тым, што пры адпаведнай масавай рабоце пры выразнай рабоце МТС раён можа дабіцца значна большых посьпехаў як у галіне калектывізацыі, так і разгортваньня сяўбы.

Ударная сельскараўская брыгада: ШЭШКА, КАЦНЭЛЬСОН, ХАРЫТАНОВІЧ, МАЦЮХІН, ШЫНЧЫК, ЛЯВОШКА, УСЕНЯ.

Агляд друку

У ролі дрэннага фіксатара

XVI партзьезд, вызначаючы вялікія гістарычныя задачы, якія стаяць на шляху карэннай сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, запісаў у сваіх пастановах:

«Рашаючае значэньне для работы партыі ў даны момант атрымлівае задача далейшага ўцягненьня ў калгасы бядняцка-сераднякіх гаспадараў на добраахвотных пачатках, ПРАБЛЕМА АРГАНІЗАЦЫІ ПРАЦЫ Ў КАЛГАСАХ, РАЗЬМЕРКАВАНЬНЕ УРАДЖАЮ ЎНУТРЫ КАЛГАСАЎ»... (З рэзалюцыі па дакладу ЦК. Падкрэсьлена намі).

Вялізарнай палітычнай важнасьці гэта пастанова паставіла пытаньне аб пераходзе на зьдзельшчыну — магутны стымул далейшага ўмацаваньня гаспадаркі, баяздольнасьці калгасаў, магутны вагар разгортваньня бальшавіцкіх тэмпаў у справе калектывізацыі.

Неабходнасьць правільнага хуткага ўвядзеньня зьдзельшчыны ва ўсю работу калгасаў паставіла перад друкам адказьнейшыя задачы ня толькі папулярызацыі калгасаў, якія перайшлі на зьдзельшчыну і падтрыманьня адстаючых, але разам з тым арганізацыю і прапаганду гэтага пераходу. Рад газэт здавалі экзамэн на ўменьне ўчаліцца за зьдзельшчыну, як асноўнае зьвяно на даным этапе калгаснага руху, перабудаваць сваю апэрацыйную работу такім чынам, каб забясьпечыць пасьпяховае правядзеньне зьдзельшчыны і актывізаваць гэты пераход ва ўсіх калгасах.

***

Раённая Лепельская газэта **«Калгасная праўда»** да красавіка ўпарта і ганебна абыходзіла моўчкі пытаньні зьдзельшчыны. І толькі ў нумары **14** за **4** красавіка газэта зьмяшчае артыкул **«Арганізацыя працы — асноўнае зьвяно калгаснага будаўніцтва».**

У наступным нумары газэта досыць палахліва выходзіць з матар'яламі аб зьдзельшчыне. За шмат абяцаючай шапкай на ўсю паласу: **«На аснове зьдзельшчыны і ўдарных норм выпрацоўкі выканаем і перавыканаем пляны калгаснай сяўбы і забясьпечым новы магутны прыліў у калгасы»** — пытаньням зьдзельшчыны адводзяцца дзьве маленькія заметкі. А ў іншых матар'ялах, зьмешчаных на гэтай паласе аб зьдзельшчыне, нават не ўпамінаецца слова зьдзельшчына.

Цікавы матар'ял дзьвёх зьмешчаных заметак. У аднэй з іх пад загалоўкам **«Зьдзельшчына ў калгасе «Калініна» ўведзена»** газэта піша:

«Увесь зімовы час загатоўка лесаматар'ялу праводзілася на зьдзельшчыне. Дзенная норма выпрацоўкі зьдзельшчыны на аднаго каня ½ кбм. на адлегласьці 18 клм... Коні і вазавы матар'ял замацаваны за кожным возчыкам. Зараз праўленьне выпрацавала зьдзельшчыну на веснавы час сяўбы».

Да рэчы зьдзельныя нормы выпрацоўкі ўводзяцца не на коняй, а на людзей, якія калі лепш дагледзяць каня, больш будуць мець карысьці, і ня коні прымацоўваюцца да калгасьнікаў, а наадварот. Аб гэтым трэба памятаць рэдакцыі «К. П.».

Вельмі добра, што ў калгасе імя Калініна ўжывалася зьдзельшчына па вывазцы лесаматар'ялу. Але-ж у другой палове красавіка перад пачаткам сяўбы асноўнае ня нормы выпрацоўкі на вывазку лесаматар'ялаў, а ўвядзеньне зьдзельшчыны на ўсе віды работ, якія будуць ужывацца ў часе веснавой сяўбы. А імкнка гэтага асноўнага «К. П.» не зрабіла. Характэрна разуменьне газэтай зьдзельшчыны. Ва ўсіх паданых матар'ялах газэта трактуе зьдзельшчыну, як нормы выпрацоўкі, і забывае аб такой «дробязі», як ацэнка нормы ў працадніх.

І ў другой заметцы пра калгас «Згода» — таксама няма паказу, якжа калгас перайшоў на зьдзельшчыну, якія нормы выпрацоўкі ўжываюцца па якіх відах работ, ацэнка іх у працадніх.

Вялікім палітычным ляпсусам гэтага нумару газэты зьяўляецца тое, што ў перадавой, прысьвечанай вынікам пленуму райкому КП(б)Б па пытаньнях далейшай калектывізацыі, ні слова не гаворыцца аб увядзеньні зьдзельшчыны.

У наступным нумары 16 газэта зноў выступае з вялікай шапкай на ўсю паласу. Але і тут, як і ў папярэднім нумары, з вялікага грому малы дождж. За вялікай шапкай толькі дзьве заметкі ў 80 радкоў адведзены зьдзельшчыне. У аднэй з гэтых заметак газэта паведамляе аб ганебных фактах па ўвядзеньні зьдзельшчыны — як гэтай справай кіруе Лепельскі райкалгассаюз. 18 красавіка, калі застаюцца лічаныя дні да выхаду ў поле, у раёне не праведзен ні адзін калгас на зьдзельшчыну. Прыкладныя нормы выпрацоўкі рассылаюцца па калгасах з вялікім спазьненьнем. Райкалгассаюз зусім ня кіруе справай зьдзельшчыны.

Газэта не дае належнай палітычнай ацэнкі такім адносінам з боку Лепельскага райкалгассаюзу, як праваапартуністычным. І ў далейшых нумарох газэта не правярае, як-жа райкалгассаюз кіруе пераводам калгасаў на зьдзельшчыну.

У другой заметцы газэта становіцца ў позу абаронцы аб'ектыўных прычын. Гаворачы аб тым, што калгас «Калгасная праўда» пераходзіць на зьдзельшчыну, газэта канчае наступнымі словамі гэту заметку:

«Аднак, да поўнага пераходу на зьдзельшчыну ў часе веснавых палявых работ перашкаджае адсутнасьць адзінага масьву яравога кліну, бо насеўная плошча накуль што знаходзіцца ў раскінутым выглядзе і немагчыма плянава паладзіць ворыва».

Ніхто ня будзе спрачацца з тым, што раскінутасьць палёў перашкаджае нармальнай рабоце калгасу. Але гэта ні ў якім разе ня можа і не павінна зьяўляцца тормазам да пераходу на зьдзельшчыну.

Зьмяшэньнем такіх матар'ялаў, як апраўданьне «аб'ектыўных» прычын, газэта на сутнасьці выступіла супроць пераходу на зьдзельшчыну, чым дапусьціла грубую, бадай, самую значную палітычную памылку. Гэтай памылкі газэта ў сваёй далейшай рабоце ня выправіла, як і ня выправіў яе Лепельскі райком КП(б)Б, органам якога зьяўляецца «Калгасная Праўда».

«Калгасная праўда» не растлумачыла сутнасьці пераходу на зьдзельшчыну, — не растлумачыла сутнасьці працадня. Газэта не паказала прыкладу перадавых калгасаў, не навучала адстаючых. Газэта прагледзела клясавую барацьбу, якая адбываецца вакол увядзеньня зьдзельшчыны.

***

«Калгасная праўда» не змагла ўчапіцца за асноўнае зьвяно калгаснага руху — за зьдзельшчыну, не мабілізавала калгасьнікаў раёну, сваіх селькораў на барацьбу за зьдзельшчыну. Газэта аказалася ў ролі фіксатара, прычым фіксатара дрэннага. «Калгасная праўда» ў справе пераводу калгасаў Лепельшчыны на зьдзельшчыну ня выканала сваёй ролі, як калектыўнага арганізатара і прапагандыста. Неабходна карэнная перабудова работы газэты «Калгасная праўда».

Дырэктывы партыі і ўраду Зайкоўскі сельсавет выканаў

МЕЖА, 10. (Па тэлеграфу).

ЗАЙКОЎСКІ сельсавет Мемышчыны на 10 мая вызначыў дырэктыву партыі і ўраду па калектывізацыі. У калгасы ўвайшлі 264 гаспадаркі або 33 проц. усіх гаспадарак сельсавету.

Сакратар парт'ячэйкі
АРЛОЎ.

Камсамол у баку ад барацьбы за сілас

У **КОПЫСЬКІМ** раёне ў мінулым годзе сіласаваньне было праваленa. Раённыя арганізацыі ня здолелі згуртаваць масу калгасьнікаў і аднаасобнікаў на выкананьне сіласнай кампаніі. У выніку многія калгасы раёну зараз перажываюць значныя труднасьці з кармамі.

Толькі ў адным Старасельскім сельсавеце былі закладзены дзьве ямы сіласу. І зараз у гэтых калгасах ёсьць чым карміць жывёлу.

Вынікі сіласаваньня мінулага году павінны паслужыць урокам для раённых арганізацый і калгасаў. Між тым у раёне і зараз не аддаецца належная увагі справе сіласаваньня. Камсамол, які павінен быць ініцыятарам барацьбы за сілас, стаіць у баку ад гэтай справы. Трэба безадкладна пакончыць з недаацэнкай значэньня сіласу ў вырашэньні кармавой праблемы.

Брыгадзір «Зьвязды» ГЕНІН.

НА ПАЛЁХ ПАЎЗЬМЕЖЖА

1. ПА СЬЛЯДОХ пераможнага наступленьня

(Ад нашага спэцыяльнага карэспандэнта)

На той бок мяжы, дзе пачынаецца Заходняя Беларусь, над аховай двухмільёнавага арда тысячы сялян адзінока мяцуцца за плугам і змораным галодным канём.

На савецкім баку весела барозьняць трактары і дружна працуюць калгасныя брыгады, спраўляючы другую бальшавіцкую вясну.

На фоне гэтага малюнку вялікія посьпехі сацыялістычнай рэканструкцыі вёскі сельскагаспадарчы Койданаўская раёна—гэтага маленькага прымежнага вугалку БССР, вялізарнай краіны Саветаў—выпукляюцца асабліва рэзка. Даволі адзначыць, што сельсаветы, якія ўжо набліжаюцца да завяршэньня поўнай калектывізацыі. На сёньняшні дзень яны калектывізаваны на 60-90 проц.

Койданаўшчына сьвяткуе сваю вялікую перамогу. Яна ўжо ў цэлым выканала дырэктыву партыі аб 50-процантнай калектывізацыі, як раён абслугоўваньня МТС. 66 проц. яравога кліну гэтага раёну засяваюць калгасы.

Гаваючы посьпех дала першая дэкада мая. Выхад у поле калгасаў вызначаў бурны прыліў. 9 проц. бядняцка-сераднякіх гаспадарак раёну вырашылі вылучыцца да калгасаў як толькі на ворыва выйшлі трактары і калгасныя брыгады пачалі правядзеньне.

У верасьні 1930 году Койданаўшчына была калектывізавана толькі на 9 проц., у студзені 1931 году—на 28 проц. Зараз-жа ў 90 калгасах аб'ядналася ўжо палова бядняцка-сераднякіх гаспадарак раёну. Гэты вялізарны посьпех тлумачыцца тым, што партарганізацыя ў асноўным вяла з бальшавіцкай рашучасьцю праводзіць генэральную лінію партыі, мабілізаваць масы калгасьнікаў і аднаасобнікаў—беднякоў і сераднякоў на барацьбу з кулаком. Вялікая заслуга койданаўскай МТС, якая на справе паказала, што зьяўляецца магутным вагаром сацыялістычнай рэканструкцыі вёскі.

Наступленьне на капіталістычныя элементы і барацьба з апартуністамі—вось мэтады, якімі карысталася партыйная арганізацыя ў барацьбе за другую бальшавіцкую вясну. Аб гэтым гую бальшавіцкую вясну. Аб гэтым сьведчыць хаця-б практыка загатовак, правільнае правядзеньне якіх дало ў радзе сельсаветаў вялікі ярух у калектывізацыі, а таксама і практыка ачысткі калгасаў ад кулакоў. Наколькі калгасы былі засьмечаны клясавым ворагам сьведчыць той факт, што да сучаснага моманту ўжо вычышчана каля 50 кулакоў. Нама ніводнага старога калгаласкоў. Нама ніводнага старога калгаласкоў. Нама ніводнага старога калгаласк

Ударныя гарсаветы трэцяга рашаючага павінны апраўдаць сваю назву сапраўды бальшавіцкай работай

Асноўны наказ выбаршчыкаў—павярнуцца тварам да вытворчасьці—гарсаветамі БССР яшчэ ня выкананы

Аб гэтым сьведчыць дрэнное кіраўніцтва і сувязь саветаў з дэпутацкімі групамі, зусім слабая работа апошніх, адсутнасьць да гэтага часу дэпутацкіх груп на радзе буйных прадпрыемстваў

ТВАРАМ ДА ВЫТВОРЧАСЬЦІ!

Гарсаветы апошняга скліканьня — ударныя гарсаветы трэцяга рашаючага атрымалі ад сваіх выбаршчыкаў баявы наказ — павярнуцца тварам да вытворчасьці, да прамфінпляну, да ўдарніцтва.

Асноўная фігура ў гарсаветах у апошнюю перавыбарчую кампанію зрабіўся ўдарнік — непасрэдны змагар на прадпрыемстве за выкананьне прамфінпляну, за пяцігодку — за чатыры гады. Праз гэтага ўдарніка — члена савету, праз дэпутацкія групы на прадпрыемствах гарсаветы павінны былі арганізаваць і ўмацоўваць цесную сувязь з вытворчасьцю, кіраваць барацьбой за прамфінплян, за зьніжэньне сабекошту і ўзьняцьце якасьці прадукцыі, за разгортваньне сацспаборніцтва і г. д.

Гэты баявы наказ выбаршчыкаў яшчэ ня выкананы гарсаветамі ў выстарчальнай меры. Сёньня мы друкуем матар'ялы аб рабоце дэпутацкіх груп Менскага гарсавету на прадпрыемствах, аб кіраўніцтве гэтымі групамі з боку гарсавету.

Ударны савет сталіцы БССР, дабіўшыся бязумоўна поўнага пералому ў сваёй рабоце, яшчэ не даволі рашуча павярнуўся тварам да вытворчасьці, не арганізаваў яшчэ сыстэматычнай сувязі савету з заводамі і фабрыкамі гораду.

Той факт, што да гэтага часу яшчэ не на ўсіх буйных прадпрыемствах арганізаваны дэпутацкія групы, што існуючыя групы працуюць дрэнна, бяз жывога кіраўніцтва і інструктажу з боку Гарсавету сьведчыць аб правільнасьці нашага цьверджаньня.

Тое самае мы маем і ў іншых гарадох БССР. Шматлікія лісты з месц, якія штодзенна паступаюць у рэдакцыю паведамленьні рабкораў з розных прадпрыемстваў паказваюць, што гарсаветы буйных прамысловых гарадоў БССР (Гомельскі, Віцебскі, Рэчыцкі, Слуцкі і іншыя) ўсё яшчэ не перабудавалі поўнасьцю сваёй работы ў адпаведнасьці з тэмпамі трэцяга рашаючага году пяцігодкі, з тым, каб на справе апраўдаць сваю назву ўдарных саветаў.

Сэкцыі гарсаветаў працуюць слаба. Масавая работа ня ўзьнята на належную вышыню. Дэпутацкія групы ня ўсюды арганізаваны, а там, дзе ўжо арганізаваны, яны працуюць дрэнна, нярэдка бясплённа і, што самае галоўнае, без належнага кіраўніцтва з боку Гарсавету.

Патрэбен рашучы пералом. Гарсаветы БССР павінны неадкладна перабудаваць сваю работу так, каб яна цалкам была падпарадкавана задачам паставленым перад гарсаветамі партыяй і ўрадам.

У бліжэйшы час павінны быць поўнасьцю аформлены дэпутацкія групы на ўсіх буйных прадпрыемствах. Сувязь і кіраўніцтва дэпутацкімі групамі трэба ўзмацніць. Трэба, каб дэпутацкія групы поўнасьцю ўсьвядомілі сваю ролю, як важнейшых і асноўных зьвенняў сувязі саветаў з шырокімі масамі сваіх выбаршчыкаў, з рабочымі заводаў і фабрык, якія паслалі іх у гарсавет у якасьці сваіх прадстаўнікоў.

Па прыкладу Масквы, Ленінграда, Харкава, Дняпрапятроўску і іншых гарадоў Саюзу, гарсаветы БССР павінны разгарнуць **шырокую пераклічку сваіх дэпутацкіх груп**, паставіць работу апошніх сапраўды па-баявому.

У гэтай важнейшай задачы гарсаветам павінны актыўна дапамагчы партыйныя і прафэсыйныя арганізацыі прадпрыемстваў, дзе дэпутацкія групы існуюць. На жаль, да гэтага часу партыйныя калектывы і ячэйкі, фабрычна-заводзкія камітэты на прадпрыемствах у большасьці не аддавалі належнай увагі арганізацыі і рабоце дэпутацкіх груп, амаль зусім ня цікавіліся гэтай справай. Гэта буйны недахоп, які трэба неадкладна выправіць. Партыйныя і прафэсыянальныя арганізацыі прадпрыемстваў павінны ня толькі цікавіцца, ня толькі дапамагаць у рабоце дэпутацкіх груп, але і кіраваць гэтай работай.

Масавая работа павінна стаяць у цэнтры ўвагі гарадзкіх саветаў. Гэту работу трэба пабудаваць на тым прынцыпе, што ўдарнік — асноўная фігура ў гарсавеце — павінен у сябе на вытворчасьці прымаць актыўны ўдзел у кіраўніцтве дзяржавай не праз пасыўнае фіксаваньне тых ці іншых непаладкаў і прарываў, а шляхам актыўнай і поўнай перамогі гэтых прарываў. Трэба рашуча адмовіцца ад старых ажыўшых сябе мэтадаў работы гарсаветаў, якія заключаліся толькі ў шматлікіх абсьледваньнях, у пасыўным рэгістраваньні фактаў.

Кожная сэкцыя, брыгада, дэпутацкая група гарсавету павінна дабіцца, каб усе мерапрыемствы, якія праводзяцца гарсаветам давалі максымальны станоўчы эфэкт.

Выканаць асноўны наказ выбаршчыкаў

Менгарсавет слаба кіруе дэпутацкімі групамі на прадпрыемствах

Прайшло ўжо каля 4 месяцаў з часу перавыбараў МЕНСКАГА ГАРСАВЕТУ. За гэты час гарсавет бязумоўна дабіўся поўнага зруху ў бок перабудовы сваёй работы. Аднак, мы прымушаны канстатаваць, што на сёньняшні дзень у рабоце гарсавету ёсьць яшчэ буйны недахоп. Гэта—слабая сувязь з прадпрыемствамі, невыстарчальная ўвага арганізацыі дэпутацкіх груп, слабае кіраўніцтва існуючымі групамі.

Даволі сказаць, што да гэтага часу яшчэ не на ўсіх прадпрыемствах арганізаваны дэпутацкія групы. На такім буйным прадпрыемстве, як ЗАВОД ІМЯ ВАРАШЫЛАВА, дэпутацкай групы яшчэ няма. Там, дзе дэпутацкія групы існуюць, яны працуюць слаба, без адпаведнага кіраўніцтва, як з боку гарсавету, так і з боку мясцовых партыйных і прафэсыянальных арганізацый. Як прыклад можна прывесьці ШВЭЙНУЮ ФАБРЫКУ «КАСТРЫЧНІК», ГАРБАРНЮ «БАЛЬШАВІК» і інш.

На швэйнай фабрыцы дэпутацкая група існуе толькі фармальна, ніякай канкрэтнай работы не вядзе. Дэпутацкая група гарбарні «Бальшавік» здолела арганізаваць вакол сябе 51 рабочага і разгарнуць практычную работу. Але ў выніку адсутнасьці належнага кіраўніцтва дэпутацкая група ўжо спачатку свайго існаваньня дапусьціла буйнейшую палітычную памылку. У пляне сваёй работы група ня вызначыла сваёй ролі ў барацьбе за выкананьне прамфінпляну. У пляне няма ніводнага слова аб разгортваньні сацспаборніцтва, аб удзеле ў гэтай рабоце дэпутацкай групы.

Гарсавет абмежаваўся рассылкай сухой інструкцыі дэпутацкім групам. Жывога кіраўніцтва, сыстэматычнай сувязі з прадпрыемствамі гарсавет не нападзіў. На сёньняшні дзень гарсавет нават ня ведае, колькі дэпутацкіх груп ўжо арганізавана, дзе іх яшчэ патрэбна арганізаваць і як працуюць існуючыя групы.

Гэты факт сьведчыць аб тым, што гарсавет, ня гледзячы на поўны зрух у рабоце, яшчэ не дабіўся поўнага выкананьня асноўнага наказу выбаршчыкаў, ГРУНТОЎНА не павярнуўся яшчэ тварам да вытворчасьці, да прамфінпляну.

Трэба неадкладна дабіцца пералому ў гэтым напрамку. Гарсавет павінен зараз-жа пераключыцца на баявыя рэйкі, неадкладна прыступіць да выкананьня асноўнага наказу выбаршчыкаў.

М. САКАЛОЎСКІ.

ШЭФСТВА—НА ПАПЕРЫ

БАРЫСАЎ. Шэфства над дзяржаўным апаратам у Барысаве не нападжана. У часе месячніка праверкі і арганізацыі шэфства некаторыя прадпрыемствы прынялі шэфства над установамі, але гэта засталося толькі на паперы. Так, завод «ПРАФІНТЭРН» узяў шэфства НАД АДДЗЯЛЕНЬНЕМ ДЗЯРЖБАНКУ. Аднак, да гэтага часу нічога канкрэтнага для ажыцьцяўленьня рабочага кантролю над апаратам падшэфнай установы ня зроблена. Ніякай сувязі паміж фэшамі і падшэфнымі няма.

На паасобных прадпрыемствах арганізаваны добраахвотныя шэфскія брыгады, але яны не працуюць. Асноўная прычына гэтага — адсутнасьць належнага кіраўніцтва з боку вышэйшых партыйных і прафэсыянальных арганізацый. Райпрафсавет нічога практычнага не зрабіў для арганізацыі сыстэматычнага кіраўніцтва шэфскай работай. Партыйныя калектывы і ячэйкі на прадпрыемствах недаацэньваюць гэтай работы, ня кіруюць шэфскімі брыгадамі, ня цікавяцца работай падшэфных устаноў.

Ва ўстановах ёсьць шмат ненармальнасьцей, безгаспадарчасьці, ня выконваюцца дырэктывы вышэйшых партыйных і савецкіх органаў, зрываюцца пляны гаспадарча - палітычных кампаній (загатоўкі, кантрактацыя і г. д.). Усё гэта зьяўляецца вынікам адсутнасьці масавага рабочага кантролю зьнізу над работай савецкага апарату.

Трэба неадкладна ажывіць шэфскую работу. Шляхам жывога кіраўніцтва шэфскімі брыгадамі, арганізацыі сацыялістычнага сумяшчэньня ва ўстановах трэба нападзіць сыстэматычны масавы пралетарскі кантроль над работай дзяржаўнага апарату. Раённыя партыйныя і прафсыянальныя арганізацыі павінны зараз-жа па-баявому ўзяцца за гэту справу.

Б. Я.

Ф-ка „Спартак" узяла шэфства над шклоўскім спажтаварыствам

ШКЛОЎ.

Рабочыя фабрыкі «Спартак» прынялі шэфства над шклоўскім **гарадзкім спажтаварыствам.** Нядаўна адбылася канфэрэнцыя рабочых фабрыкі разам з калектывам работнікаў спажтаварыства, на якой быў заключан дагавор аб шэфстве. Рабочыя абавязаліся ўстанавіць сыстэматычны масавы рабочы кантроль над работай спажывецкага таварыства, дапамагчы яму ў выкананьні пастаўленых перад ім задач.

Паасобныя цэхі фабрыкі прымацаваны да прыгараднай гаспадаркі, адкормачнага пункту, закрытага разьмеркавальніка, сталоўкі і г. д.

У мэтах паскарэньня пабудовы адкормачных пунктаў, а таксама арганізацыі прыгараднай гаспадаркі рабочыя абавязаліся ў бліжэйшы тэрмін унесьці авансавыя ўклады на прыгарадную гаспадарку і адкормачныя пункты ў разьмеры 30 проц. паю.

Праўленьне гарспажтаварыства са свайго боку абавязалася поўнасьцю выканаць план веснавой пасеўнай кампаніі прыгараднай гаспадаркі. Рабочыя абяцалі шляхам арганізацыі спэцыяльных брыгад, суботнікаў аказваць максымальную дапамогу прыгараднай гаспадарцы ў выкананьні плянаў пасеўнай і ўборачнай кампаній. **Кожны рабочы фабрыкі будзе працаваць у прыгараднай гаспадарцы ня менш аднаго дня ў месяц.** Такая-ж дапамога будзе арганізавана з боку сем'яў рабочых з аплатай натурай за прапрацаваны час.

Дэпутацкая група не працуе

(Фабрыка „Кастрычнік"— Менск)

Яшчэ 12-га красавіка на фабрыцы была арганізавана дэпутацкая група ў ліку 20 чалавек. Ня гледзячы на тое, што прайшоў ужо цэлы месяц, дэпутацкая група пакуль што існуе толькі на паперы. Практычнай работы група не вядзе. Яна абмежавалася толькі абраньнем бюро і выпрацоўкай пляну. Больш нічога ня зроблена.

Асноўнай прычынай дрэннай работы групы зьяўляецца адсутнасьць усякага кіраўніцтва ёю. Ні гарсавет, ні фабрычныя партыйная і прафэсыянальная арганізацыі ня кіруюць групай. Фабрычны камітэт нават ня ведае, што намеціла група ў сваім пляне работы.

Гарсавет толькі прыслаў групе афіцыяльную інструкцыю. Жывой сувязі і кіраўніцтва групай з боку гарсавету няма.

Ц.

ТЭРМІН ПРАЙШОЎ—ЗАДАНЬНЕ НЯ ВЫКАНАНА

Ганебныя тэмпы адгрузкі насеннай бульбы пагражаюць пасеўным плянам Масквы, Ленінградзкай вобласьці і Украіны

Раённыя кіруючыя арганізацыі адказваюць за выкананьне дырэктыў ЦК і СНК аб сваячасовай адгрузцы бульбы

Неадкладна фарсаваць адгрузку бульбы. У бліжэйшыя дні скончыць яе

Ніякіх апраўданьняў, ніякіх „аб'ектыўных прычын"

Адгрузку насеннай бульбы Маскве, Ленінградзкай вобласьці і Украіне — БАЯВАЯ НЕАДКЛАДЛАЯ ЗАДАЧА. Несваячасовае выкананьне гэтай задачы ставіць пад сур'ёзную пагрозу пасеўныя пляны гэтых асноўных прамыслівых цэнтраў.

Чацьвёрка ЦК КП(б)Б і СНК БССР, улічваючы ўсю важнасьць і адказнасьць заданьня, вызначыла канчатковы тэрмін адгрузкі насеннай бульбы —15 мая. Чацьвёрка сурова забараніла ўсякія выдаткаваньні раёнамі загатоўленай бульбы да поўнага выкананьня плянаў адгрузкі.

Аднак, тэрмін прайшоў, а заданьне ня выканана. На 15 мая БССР адгрузіла насеннай бульбы толькі 19 проц. пляну. Ленінградзкай вобласьці адгрумана 12 проц. заданьня.

Чым-жа тлумачыцца гэты прарыў?

Асноўная прычына—ВЫКЛЮЧНАЯ БЯЗЬДЗЕЙНАСЬЦЬ загатоўчых арганізацый БССР. Апошнія, ня гледзячы на сыгналы друку, на зусім выразныя дырэктывы вышэйшых партыйных і савецкіх органаў, працягваюць спадзявацца на самацёк і нічога ня робяць для ўзмацненьня загатовак і адгрузкі бульбы. Матар'ялы з месц, якія мы сёньня друкуем, паказваюць, што сыстэмы спажывецкай і с.-г. каапэрацыі ў радзе месц дагэтуль яшчэ не пераключыліся на баявыя тэмпы работы, ставяць адгрузку на апошнім пляне.

На жаль, гэта злачынная бязьдзейнасьць не сустракае рашучага адпору з боку паасобных кіруючых раённых арганізацый.

Кулак, які злосна сабатуе загатоўкі і адгрузку бульбы, да гэтага часу ва многіх раёнах застаецца непакараным. Ёсьць сельсаветы, дзе да гэтага часу яшчэ ня выкрыты ўсе кулакі. У Перасьвятаўскім сельсавеце, напрыклад, кулак Мароз пад носам у сельсавета сабатуе выкананьне цьвёрдага заданьня па бульбе і па іншых відах загатовак.

Трэба ў бліжэйшыя дні ва што-б там ні стала ліквідаваць прарыў. Масква, Ленінградзкая вобласьць і Украіна павінны сваячасова атрымаць насенную бульбу.

Раённыя кіруючыя арганізацыі адказваюць за хуткае выразнае выкананьне дырэктыў вышэйшых партыйных і савецкіх органаў. Ніякага апраўданьня, ніякіх «аб'ектыўных прычын»! Бульба ёсьць і яна павінна быць адгружана асноўным прамысловым цэнтрам.

Кулакі — сабатажнікі загатовак і адгрузкі бульбы — павінны быць прыцягнуты да суровай адказнасьці. Мясцовыя органы пракуратуры павінны арганізоўваць паказальныя суды над тымі кулакамі, якія ня выконваюць цьвёрдых заданьняў.

Тэмпы зьніжаны

Паводле даных Белсадгароднінны на 14 мая па БССР адгружана прамысловым цэнтрам 9.870 тон бульбы. Плян адгрузкі выканан толькі на **16,1** проц.

Насеннай бульбы Маскве, Украіне і Ленінградскай вобласьці адгружана 6586 тон, або **19,5** проц. Плян адгрузкі бульбы Маскве выканан на **20,7** проц., Украіне на **83,5** проц. Ленінградзкай вобласьці на **12** проц.

Тэмпы адгрузкі за апошнія дні панізіліся. Так, насеннай бульбы было адгружана за 11 мая **475** тон, 12 мая—**166** тон. 13 мая—**216** тон. Сталовай бульбы: за 11 мая—**202** тоны, 12 мая—**93** тоны, 13 мая—**167** тон.

Пасыўныя рэгістратары фактаў

ЛЕПЕЛЬ.

Сыстэмы раённай спажывецкай і сельска-гаспадарчай каапэрацыі правальваюць загатоўкі і вывазку бульбы. Райкаапсаюз выканаў усяго **14** проц. свайго заданьня.

Асноўнымі прычынамі зрыву кампаніі зьяўляецца слабы націск па кулака і адсутнасьць растлумачальнай работы сярод насельніцтва аб важнасьці загатовак і адгрузкі бульбы.

Сельсаветы па мясцох, замест баявой работы спадзяюцца на самацёк, сьцьвярджаюць што бульбы няма, што яна пашла на корм і г. д. Гэтыя настроі дапамагаюць кулацка - заможным элемэнтам ігнараваць загатоўкі бульбы ня выконваць цьвёрдых заданьняў.

Раённыя работнікі — прадстаўнікі загатоўчых арганізацый, якія выяжджаюць у сельсаветы вельмі мала робяць для ўзмацненьня загатовак. **Яны толькі пасыўна рэгіструюць факты, а практычнай работы не праводзяць.**

Трэба пакончыць з апартуністычнай недаацэнкай загатовак і вывазкі бульбы з боку раённых работнікаў і сельсаветаў. Заданьне партыі і ўраду павінна быць поўнасьцю выканана.

С.

МЕНСК

Парк культуры і адпачынку—для рабочых Менску

Перадаць пад парк павільёны і лес б. с.-г. выстаўкі

Паводле пастановы менскага гаркому КП(б)Б, у Менску павінен быць пабудаваны парк культуры і адпачынку для рабочых гораду.

Трэба ўжо зараз заняцца пабудовай парку. Пры парку павінны быць створаны розныя выстаўкі і лябараторыі, якія-б далі магчымасьць рабочым аўладаць тэхнікай. Трэба адкрыць кансультацыі па ўсіх пытаньнях, дзіцячыя куткі, дом імя «5-га дня ўдарніка» і г. д. Для гэтых мэт неабходна скарыстаць павільёны і лес, якія належалі б. с.-г. выстаўцы.

Вышэйшым органам трэба ў бліжэйшы час вырашыць пытаньне аб перадачы тэрыторыі выстаўкі і лесу ля яе пад пабудову першага ў БССР парку культуры і адпачынку.

БРАВІН.

Фарсаваць пабудову парку

(Пастанова цэхавых сходаў заводу „Дрэвааапрацоўшчык"

На цэхавых сходах рабочых ЗАВОДУ «ДРЭВААПРАЦОЎШЧЫК» абгаварвалася пытаньне аб скарыстаньні вольнага часу рабочых улетку. Сходы прызналі, што тыя сады і сквэры, якія ёсьць у Менску, зусім не здавальняюць узрастаючых патрабаваньняў да культурнага адпачынку.

У мінулым годзе рабочыя сходы вынесьлі пастановы аб тым, каб пабудаваць на тэрыторыі с.-г. выстаўкі парк культуры і адпачынку. Між тым, будаўніцтва парку ідзе вельмі павольна. Цэхавыя сходы заводу «Дрэвааапрацоўшчык» патрабуюць фарсаваньня тэмпаў будаўніцтва парку і просяць гарсавет высьвятліць тыя прычыны, якія тармозяць пабудову.

Экспэдыцыі Беларускай Акадэміі Навук

Прэзыдыум Беларускай Акадэміі Навук зацьвердзіў пляц экспэдыцый навукова-дасьледчага інстытуту геалёгіі на 1931 год. Геалёгічныя экспэдыцыі будуць пераведзены 4-ма партыямі.

Першая магілеўская партыя, пад кіраўніцтвам акадэміка Бліядуха дасьледуе басэйн ракі Дняпро і будзе вывучаць поклады будаўнічых матар'ялаў, крэйды і г. д. Партыя працуе, па заданьні Белкалгасцэнтру і Наркамзему.

Другая партыя, пад кіраўніцтвам тав. Кавалёва, займецца геалёгічным вывучэньнем ладзіянска-дуброўенскага комбінату на плошчы 230.000 гект.

Трэцяя гідра - геалёгічная партыя пад кіраўніцтвам праф. Красоўскага, дасьледуе тэрыторыю хойніцка - брагінскага агра-індустрыяльнага комбінату і скончыць геалёгічную здымку.

Чацьвертая разьведачная партыя дае рабіць досьледы, паводле даручэньня камітэту па хэмізацыі народнай гаспадаркі і ВСНГБ, у Прапойскім раёне.

На ўсе экспэдыцыі выдаецца 110 рублёў.

На дапамогу пацярпеўшым ад зямлятрасеньня

— СЛУЦКАЯ ДОБРААХВОТНАЯ ПАЖАРНАЯ ДРУЖЫНА ўнесла ў фонд дапамогі пацярпеўшым ад зямлятрасеньня 132 рублі. Выкліканы на спасборніцтва ўсе добраахвотныя пажарныя дружыны БССР.

***

— СМАЛЯВІЧЫ. (Наш кар.). Па мастэчку шырока разгарнуўся збор сродкаў на дапамогу пацярпеўшым ад зямлятрасеньня ў Савецкай Арменіі і Нахічавані. Па ўстановах раёну сабрана 132 рублі. КАЛЁКТЫЎ смалявіцкага спажывецкага таварыства ахвяраваў 56 руб. Па камітэце ўзаемадапамогі сабрана 28 рублёў. Збор сродкаў працягваецца.

Камсамольцаў—на дарожнае будаўніцтва

ЦК ЛКСМБ паслаў наступную тэлеграму ўсім гаркомам і райкомам камсамолу:

«Мабілізацыя камсамольцаў на дарожнае будаўніцтва зрываецца. За зрыў мабілізацыі перададны ў ЦКК справы аб райкамолах. Прапануецца скончыць мабілізацыю да 25 мая і аб выніках паведаміць. За невыкананьне пастановы вінаватыя будуць прыцягнуты да адказнасьці

Прыезд дзяржаўнага яўрэйскага тэатру УССР

14 мая ў летнім тэатры саду «Прэм'ер» адбылася ўрачыстая сустрэча дзяржаўнага яўрэйскага тэатру УССР з працоўнымі Менску.

З уступным словам аб ролі пралетарскага мастацтва ў сацыялістычным будаўніцтве выступіў загалчык культсэктару гарпрафсавету тав. Хоніч. Дакладчык аб рабоце і дасягненьнях тэатру зрабіў дырэктар тэатру тав. Кацман.

Прыезд украінскага дзяржаўнага яўрэйскага тэатру ў Менск віталі рабочыя заводу «Камунар» і фабрычны тэатрычнік», яўрэйскі пралетарскі паэт Ізя Харык і нам. адказнага рэдактара газэты «Акцябр»—тав. Бэр.

З адказам на прывітаньні выступіў артыст тэатру тав. Краўшынскі.

Пасьля ўрачыстай часткі адбыўся канцэрт.

Запрашаньне—Беларускаму Вандроўнаму тэатру

Кіраўніцтва цэнтральнага Маскоўскага дому Чырвонай арміі запрасіла Беларускі Дзяржаўны Вандроўны тэатр прыехаць у Маскву ца час з 15 чэрвеня да 15 ліпеня для абслугоўваньня ладаў Маскоўскай вайсковай акругі. Тэатр зараз рыхтуецца да паездкі.

Па Савецкай Беларусі

Загатоўкі—без кіраўніцтва

СЬВІСЛАЧ. (Наш кар.) У Сьвіслачы няма райснабу. Загатоўкі «рэгулюе» старшыня райсаюзу тав. Сурпін, які ўсе тавары, якія ён атрымлівае для стымуляваньня загатовак, перадае толькі спажывецкай каапэрацыі, бо іншых загатоўшчыкаў ён не прызнае. Наркамспаб БССР зусім ня ведае, што ў Сьвіслачы няма райснабу, што ён уцёк і ўсе дырэктывы, цыркуляры, тэрміновыя тэлеграмы адрасуе райснабу. Такіх паперак накапілася шмат, і ніхто імі ня цікавіцца. Часам тэхнічны апарат райвыканкому здымае копію з паперкі і «спускае» ў нізоўку. Ня трэба зьдзіўляцца таму, што па Сьвіслацкім раёне загатоўкі яек, птушак, уцілю, грыбоў сарваны.

— Чаму вы так дрэнна працуеце,— запыталіся мы ў члена праўленьня райкаапсаюзу—тав. Малаўовіча, — хіба вы ня ведаеце значэньня загатовак?

— У нас няма прамтавараў. Райсаюз нічога не адпускае.

— А колькі вы загатовілі яек, птушак?

— Мы не вядзем уліку, у нас няма статыстыкаў, мы ніякіх вестак даць ня можам.

Вось як загатоўляюць у Сьвіслачы пры дыктатарскім «рэгуляваньні» старшыні райсаюзу Сурпіна.

Л. МАНІН.

Ударыць па зрыўшчыках саўгаснага будаўніцтва

ГРЭСК. (Наш кар.). Будаўніцтва новага саўгасу імя 14 партызан—пад пагрозай. Будаўнічага матар'ялу патрэбна 1.500 кбм., вывезена толькі 600: Зусім не загатоўлены каменьні для фундаманту. Рабочая сіла ў саўгасе завербавала з ліку курсантаў ЦІПу, але Белсельбуд (11-ты вучастак) не забясьпечвае будаўнікоў патрэбнымі інструмантамі; на 60 рабочых ёсьць 50 піл. Зусім не аддаецца ўвагі харчаваньню рабочых-будаўнікоў. Да 15 мая паводле пляну трэба было пабудаваць сьвінарнік, але будаўніцтва яшчэ не пачалося.

РСІ павінна ўдарыць па зрыўшчыках саўгаснага будаўніцтва.

Ударнікі кампаніі с.-г. падатку

КАСЬЦЮКОВІЧЫ. (Наш кар.) 12-13 мая адбылася нарада старшынь і сакратароў сельсаветаў, на якой дэталёва на прапрацаваны закон і інструкцыі па сельгаспадатку на 1931 год.

Улічваючы, што новы закон аб сельгаспадатку дапамагае вырашэньню асноўных задач партыі і ўлады на вёсцы—калектывізацыі сельскай гаспадаркі і ліквідацыі кулацтва, як класы, на базе суцэльнай калектывізацыі, што фактычнае ажыцьцяўленьне гэтай задачы патрабуе сапраўды баявых тэмпаў работы па ўліку крыніц даходаў,—**удзельнікі нарады абяцалі слабе ўдарнікамі па праведзеньне кампаніі сельгаспадатку 1931 году.**

24 сельсаветы заключылі ўмовы па сацспаборніцтве на лепшае праведзеньне ўліку.

Прэзыдыум райвыканкому асыгнаваў на прэміяваньне тых сельсаветаў, якія лепш правядуць кампанію—800 руб. Устаноўлены 5 прэмій—адна 300 руб., другая—у 200 і тры—100 руб. Для дапамогі сельсаветам у рабоце па ўліку вылучаны спэцыяльныя ўпаўнаважаныя РВК.

Улік пачынаецца 20 мая, пакончыцца каля 15 чэрвеня.

Б. Д.

Паведамленьні

— Дом Асьветы. Сёньня, у 7 гадз. веч., адбудзецца адкрыты сход парткалектыву працасьветы. Парадак дня: Выніки палітэхнізацыі за 1930-31 навучальны год.

— 18 мая, у 7 гадз. веч., у арт.-канструкт. сэктары ЦСПСБ (Дом Прамсаюзаў, 2-гі паверх, пакой № 4) адбудзецца нарада добраахвотнікаў арт.—інструктару. З прычыны важнасьці пытаньняў, сваячасовая яўка добраахвотнікаў абавязкова.

Адказны рэдактар С. БУДЗІНСКІ.

19 мая г. г., у 12 гадз. дня, у доме Асьветы (пакой № 4)

АДКРЫВАЕЦЦА

Усебеларуская канфэрэнцыя па пэдагагічнай асьвеце.

На канфэрэнцыю запрашаюцца рабочыя прадпрыемстваў г. Менску, настаўніцтва і навуковыя працаўнікі.

КАЛЯНДАРНЫ ПЛЯН

перавыбарчых сходаў па выбарах дэпутатаў у Менскі гарадзкі савет рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў па тых выбарчых вучастках, дзе перавыбарчыя сходы не адбыліся.

№№ п-ч.	НАЗВА ЎСТАНОЎ І ПРАДПРЫЕМСТВАЎ	Час сходу	МЕСЦА СХОДУ	Усталяваны выбаршчыкамі
	На 28 мая.			
1.	Утрыманцы рабочых і служачых заводу імя Варашылава	7	Клюб металістаў	Барнаўскі
2.	Утрыманцы членаў саюзу мэдсанпрацы	7	Клюб Гарсавету	Нісановіч
3.	Утрыманцы членаў саюзу камунальнікаў	7	Клюб камунальнікаў	Пінхасік
4.	Утрыманцы членаў саюзаў: зямляробчага, жывёлагадоўчага, машына-трактар. і батрацтва	7	Дом калгасьніка	Якубовіч
5.	Утрыманцы каапэраваных саматужнікаў, аб'яднаных прамыслова - каапэрацыйнымі арцелямі	7	Клюб саматужнікаў	Эльперы
	На 30 мая.			
6.	Утрыманцы рабочых і служачых кушнернай фабрыкі, швэйнай лябораторыі, фабзавучу, швэйаб'яднаньня, гаргрупкому швэйнікаў, ф-кі імя 8 сакавіка, ф-кі імя Крупскай і членаў саюзу тэкстыльшчыкаў	7	Чырвоны куток ф-кі «Кастрычнік», Ленінская, 17	Барнаўскі
7.	Утрыманцы членаў саюзу хэмікаў	7	Клюб камунальнікаў	Млодзік
8.	Утрыманцы рабочых і служачых заводу «Полымя рэвалюцыі» і Белкаталяраб'яднаньня	7	Клюб Ільліча	Арлоў
9.	Неарганізаванае насельніцтва, якое пражывае ў 1 і 3 аддз. міліцыі і ўтрыманцы інвалідаў страхкасы	7	Клюб гарсавету	Дзічкоўскі
10.	Утрыманцы рабочых і служачых ф-кі «Беларуска» і іншых членаў саюзу дрэвааапрацоўшчыкаў, апрача утрыманцаў зав. «Д»	7	Клюб Эльводу	Шалкевіч

Менская гарадзкая выбарчая камісія.

„Чырв. Зорка" Пач. у 7; 8.45; 10.30 — З 15 мая лепшы фільм сэзону Экспанат з панаптыкуму. Зьвыш прагр.—хроніка саюзкіно № 20

„Культура" Пач. у 7; 8.45; 10.30 — З 15 мая новы фільм ДЖЫМ ШВАНТЭ. Зьвыш прагр. камэдыя Гомес і Джульета.

Інтэрнацыянал Пачат. 1 с. у 7 г. — З 14 МАЯ пастаянны фільм паводле апавяданьня Г О Ц А Я САРАЧЫНСКІ КІРМАШ

„Пралетары" Пач. у 7 гадз. — З 15 мая новы фільм ПРАБУДЖЭНЬНЕ ЖАНЧЫНЫ. Драма ў 6 частк.

„Юны Піянэр" Пач. з 1 г. дня. — Эпізод з грамадзянскай вайны БУХТА СЬМЕРЦІ драма ў 7 частках.

„СПАРТАК" Пач. у 6-30; 8; 9-0; 11 (Каса—з 5 гадз. — З 11-га мая вызатны фільм ПРАСТЫТУТКА драма ў 7 частках.

Патрэбна ВОПЫТНАЯ МАШЫНІСТКА, якая добра ведае беларускую мову. Зварачацца: Савецкая 63. 2-гі паверх, выдавецтва „Зьвязда"

Кошт публікацыі аб згубе 1 дакумэнту 1 р.

СПЕРМОКРИН — ЭКСТРАКТ ВЕМЕННЫХ ЯИЧЕК ЖЕРЕБЦА-ПЛЕМЯННИКА. ДЗЯРЖ. ІНСТЫТУТ ЭКСПЭРЫМЭНТАЛЬНАЙ ЭНДАКРЫНАЛЁГІІ НАРКАМАХОВЫ ЗДАРОЎЯ. Даведкі і паказаньні да ўжываньня высылаюцца по першым запатрабаваньні дэрмова. Цена 1 фляш. 30 гр.—1 р. 50 к. „ 1 фляш. 60 гр.—2 р. 00 к. „ 1 кар. у аампул.—1 р. 50 к. „ табл. 1 фл. 25 шт.—1 р. 25 к. ПРОДАЖ ВА ЎСІХ АПТЭКАХ І МАГАЗЫНАХ САН. І ГІГІЕНЫ. Пры адсутнасьці ў магазынах, аптэках, заказы і задаткі накіроўваецца—„Москва, Москворецкая, 26. Гум.

ЦК т-ва Чырвонага Крыжу БССР ПАТРЭБНЫ для пастаяннай работы наступныя работнікі: 1) Старшы бухгальтар, 2) Статыстык-інфарматар, 3) Кіраўнік спраў, 4) Машыністка-карэспандэнт. Дагаварацца ў ЦК т-ва Чырвонага Крыжу, вул. К. Маркса, № 3.

1. ЭЛЬВОД даводзіць да ведама абанэнтаў, якім складзены наштарысы на пабудову электра-ўводаў і якія да гэтага часу не аплачаны, што калі яны ня будуць аплачаны да 25 мая, будуць лічыцца анулюванымі. 2. Рабочыя і служачыя, якія атрымалі дазвол на права карыстаньня электра-энэргіяй па раскладцы прафсаюзаў і якім трэба зрабіць увод павінны ўнесьці ў касу Эльводу да 25 мая па 5 руб. у лік складаньня каштарысу. 3. Асоб. якія ня ўнеслі сваячасова аванасу на складаньне каштарысу, Эльвод будзе лічыць, як не маючых патрэбу ў атрыманьні электра-энэргіі. ЭЛЬВОД.

Намарынскім РК КП(б)Б і РКН)—(склікаецца)—(раённы зьлёт рабселькораў і рэдкалегій насьценгазэт на 24 мая 1931 г., у 11 гадз. раніцы. З ПАРАДКАМ ДНЯ: 1) Выніки ўсесаюзнага рабселькораўскага зьлёту. 2) Нізавы друк і яго роля ў сацыялістычнай перабудове вёскі. На раённы зьлёт рабселькораў павінны зьявіцца селькоры, насьценкоры, юнкоры, члены рэдкалегій насьценгазэт школьных, калгасьных, камсамольскіх і г. д. хатнікі, чырвоначутнікі і сакратары парт. камсамольскіх ячэек.

Завочныя Дзяржкурсы Росьпісу (РАЗРЫСОЎКІ) па ўсемагч. тканінах. Фарбамі: рэльеф., алейн., малев. Пырскамі. Прысыпкамі: бліскуч., бісар жомчуг і інш. Спосабы: нерасплыўч. анілін, празрыст. росьпісу мікка золата, платінавага срэбра. Росьпіс гляцян., шклян. посуды, цэлюлёіда, скуры, дрэва. Да лекцый прыкладаецца звыш 200 малюнк. (больш тэкставых). Па сканчэньні выд. пасьвідчаньне. Уменьне малюн. не патрабуецца. Падрабязнасьці высыл. за 20к. дробн. пашт. маркамі. Москва, вул. Дзяржынскага, д. № 1. ЗАВОЧНЫЯ КУРСЫ СОЮЗ.

Менск, друкарня «Зьвязды».